КАЛОСЬСЕ

II

ВІЛЬНЯ 1939

„KAŁOŚSIE" — KWARTALNIK LITERACKO-NAUKOWY

«КАЛОСЬСЕ»—беларускі літаратурна-навуковы і грамадзкі часапіс. Выходзіць раз у тры месяцы. Складка ў год—2 зл.
— Асобная кніжка — 50 гр. Заграніцу 3 зл. 20 гр. —

Адрыс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вул. 1—2.

«KAŁOŚSIE» — białoruski literacko - naukowy i społeczny kwartalnik. — Wilno, Zawalna 1—2.

«KALOŚSIE» — blancruthenienne revue trimensuelle litteraire et scientifique. Wilno, Zawalna 1—2. Pologne.

Зьмест кніжкі 2 (19) „Калосься“

Бачына

(Працяг зьместу на 3 бач. вокладкі)

Drukarnia Białoruska im. Franciszka Skaryny — Wilno, ul. Zawalna 1

ПІЛЬНАЕ! *ВАЖНАЕ!*

ПРЫЙМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА АНТОЛЁГІЮ ПАВАЕННАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

Антолёгія—гэта збор выбраных лепшых узорных твораў паэзіі. У анталёгію беларускай паваеннай паэзіі увойдуць творы каля 50 паэтаў: усходніх і заходніх.

З мноства беларускіх савецкіх паэтаў у зборнік увойдуць паэты найбольш рэпрэзэнтатыўныя, нажаль у нас мала ведамыя. Сярод іх многа зліквідаваных камуністычнымі маскоўскімі уладамі. Першым чынам з савецкіх маладых паэтаў у зборнік увойдуць: Язэп Пушча, Уладзімер Дубоўка, Максім Лужанін, Алесь Дудар—Глыбоцкі, Уладзімер Жылка, Валеры Маракоў, Паўлюк Трус, Алесь Звонак, Уладзімер Хадыка, Міхась Чарот, А. Ушакоў, А. Александровіч, Пятрусь Глебка, Пятрусь Броўка, і многа, многа іншых. У журнале „Калосьсе“ некаторыя з гэтых паэтаў ведамы з перадрукаваных іхніх твораў.

З заходніх паэтаў у зборнік увойдуць творы Н. Арсеньневай, Міхася Машары, Максіма Танка, Хв. Ільляшэвіча, Міхася Васілька і іншых аўтараў.

У кнізе кожнага з паэтаў будзе папераджаць кароткая аўтобіографія або біографія і кароценькая характарыстыка яго творчасьці, а такжа будуць зьмешчаны многіх паэтаў фатаграфіі.

Апроч надрукаваных твораў, у кнізе чытач знайдзе на першых бачынах адпаведныя артыкулы аб беларускай літаратуры.

Кніжка фармату 21×15 см. налічаць будзе каля 300 бачын. Добрая папера.

Кніжка выйдзе з друку у чацьвертым квартале сёлета. Рэдагуюць кніжку рэдактары і супрацоўнікі „Калосься“.

Дзеля таго, што выданьне кніжкі вымагае вялікіх коштаў, выдавецтва антолёгіі беларускай паваеннай паэзіі просіць усіх зацікаўленых парупіцца прыслаць падпіску.

Падпіска на одзін экзэмпляр „Антолёгіі“ ліча 5 зл. Па выданьні кніжка будзе даражэйшай.

Парупцеся прыслаць падпіску! Грошы перасылаць на адрас выдавецтва „Калосься“: Вільня, Завальная 1—2. Паштовы нумар разрахунковага перақазу „Калосься“ — 58.

Антолёгія беларускай паваеннай паэзіі павінна знайсьціся ў кожнай беларускай хаце, у кожнага беларускага інтэлігента, у кожнага Беларуса, у кожнага зацікаўленага справамі й развоем беларускай літаратуры чалавека чужой нацыянальнасьці.

Рупцеся прыслаць заказ—падпіску! Гэтым прысьпешыцца выданьне вельмі цэннай і патрэбнай кніжкі.

Рэдакцыя і выдавецтва

„Антолёгіі беларускай паваеннай паэзіі“

Białoruska Drukarnia im. Fr. Skoryny, Wilno, ul. Zawalna 1—2.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ І ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС

КНІЖКА 2 (19). КРАСАВІК—МАЙ—ЧЭРВЕНЬ, 1939. ГОД V.

СЯРГЕЙ ХМАРА

Чуеш?!

Чуеш?! Ці чуеш?! Ідзе пераклічка:
Дзісна і Горадня, Бельск...
Слонім, Палесьсе. Хто іх паліча?!—
Голас вясковых асель.

Плюнулі волавам
ў вочы дзён шалых...
Стальлю расплаўленых слоў.
Часу ліхому ў грудзі—кінжалам!..
Трухлядзь паслаўшы на злом.

Чуеш, як гойкаюць?! Йдзе пераклічка.
...Звоняць ў адказ журавы...
...Сонца свабоднае нівай пшанічнай
нам сустракаць!
...А ня вы...
вёсак радзімых злыя прадажнікі,
ніў беларускіх закал,

сонца сустрэнеце, — іншае, важкае.
Вам! Скура дзе — ідэал.
З Прыпяці шэрай... балот і шувараў,
з пушчаў, пружанскіх лясоў,
з Нарачы тоняў, сланімскіх імшараў,
з Бельскіх, Браслаўскіх пяскоў.

Чуеш?! Як гойкаюць! То-ж пераклічка!—
Моцны мы! Цьвёрды! Жывы!
Цяглiцы пружацца, сэрцы крынічаць...
Мы-ж — авангард веснавы!

*
* *

Ня маеце права кідаць нам у вочы,
што мы непатрэбна блудзілі гады, —
праз шэрыя будні
і чорныя ночы
пад сьцягам Пагоні —
трымалі рады.

Мы сеялі словы, і песьні, і думы,
як золата-зерне,
на роднай ральлі;
цярпеньне і мукі мы клалі на струны
і з верай упартай да сонца брылі.

З вясковых ваколіц нясьлі адгалосьсе,
дзе радасьць і гора
цьвіцелі як мак,
мы чулі, як ў полі шумела калосьсе,
як моладзь сьпявала
і плакаў жабрак.

Былі званарамі —
званілі трывогу,
ў сумленьне і душы цадзілі зару;
мы самі пралoжым да сонца дарогу,—
ня зблудзім у полі,
ні ў цёмным бару.

Мы Згоду Народаў, як сонца кахаем,
як ськібы счарнелай ад поту зямлі;
стаім мы на варце
над зморaным краем,
ідзём мы да Праўды, —
да брацкай сям'і.

Вільня

(з паэмы: „Сілаш Істома“)

Я гэты горад знаю з даўных дзён,
дзе дрэмяць замку гордыя руіны,
дзе сплёў густое вецьце ясень, клён
над сном акамянелым Гэдыміна;
а пад аркадамі сівых муроў
праходзяць цені вулкамі вузкімі:
пясьняр Літвы, ніў грэчнявых, лясоў
у падарожным плашчы пілігрыма,
і Каліноўскі, і таварышы...
І чую шопат іх у змроку шэрым.
А мо' Вяльля гэта ў начной цішы
высокіх сосен падмывае бераг?..

І хоць навісшых камяніцаў сінь
начэй нямала крые бяспрытульных,
а ў збуджаным напеве успамін: —
шуміць палын, крушына ды багуньнік;
і кожны дзень з-за хмараў устае,
і рэдка калі гасьне ў пазалоце,
і вецер песьні звонкія мае
тут рве на струнах—на калючым дроце.
Усё-ж люблю я гэтых вуліц гул,
напеў сырэнаў у тумане раніц
і моладасьць, абвітую ў тугу,
якой у вочы можна сьмела глянуць.

Груган

(з паэмы: „Сілаш Істома“)

На узгорках за Зялёным Лугам
сьпіць глуха адзьвінеўшая зямля.
Сядзе на дратох калючых груган,
загледзіўшыся на курганны шлях.
То на захад, то на ўсход мяцелі
і качавыя воблакі дымяць,
толькі сьлед пагостаў анямелых
і боль ня лёгка ветрам зараўняць.
Бліндажы, разьбітыя акопы,
пад сьнегам косьці, вочаў глыбіня —

і таму, калі віхор падхопіць,
так цяжка крыльле игругану падняць.

Недзе ные скрып і гул цяплушак.
Бліжэй зьвіняць знаёмыя шляхі.
На гармоніках басы частушак
і моладасьць і сіні небасхіл.
Пэўна вёсны з выгараў абмыюць
зялёнай верхаводкай сіні дым
і скупаюцца сярпы стальныя
і жнеяў песьні ў жыце залатым.
Але доўга будзе нехта плугам
жвір сьлёзаў з хвалямі пяску раўняць, —
таму з узгоркаў, за Зялёным Лугам,
так цяжка крыльле игругану падняць.

Дома

(з паэмы: „Сілаш Істома“)

Пяюць і пяюць акрутні,
палазы на марозе.
Над Зялёным Лугом тлее прозалаць дня.
Чырвоныя сінія інію іскры маросяць.
Воўчым сьледам брыдзе па палёх цішыня.
У вулцы, на цёмных высокіх калкох-верацёнах
вецер сьнежнага кужалю туга навіў.
Дзе-не-дзе чарнее навоз па дарозе і гоне
сівер калева сена — балотнай травы...

Ліецца з вадой
ля калодзезяў говар і стыне.
— А, пашана!.. ў вясельле прыехаў дамоў?..
Сілаш плюшчыць вочы ад сонца, ад словаў Юстына
і ад яснай усьмешкі ў ашчэры зубоў.
У хаце шумяць, быццам ў подзе, сялянскія жорны.
З бэляк капае зелень хваёвая ў дым.
Эх, белы прастор!
Вераб'іны ты дзень новагодні!
Эх, аб чым, скрыпачы, пяцё Маладым?!
За стар можа трохі дзяцюк, але знае работу.
Паўвалокі зямлі...
Мо' ня хмеліцца так
яго русы чуб маладзецка, юхтовыя боты
не адзвоняць падковай лявоніхі такт.
А Зося?..
Што шэпчацеся па кутках маладзіцы?!
Вочы караю кветкай, агнём расьцьвілі.

Ня цяжка ей будзе над бёрдам, над серпам сьхіліцца,
калі ў скоках так лёгка ей стан пахіліць!
Хай блукае смугла ня зьмятая вуснаў усьмешка,
грудзі стройныя дыхаюць пад палатном...
Няраз мо' прыйдзецца ісьці заімглёнаю сьцежкай,
не адну кукаваць над калыскаю ноч...

Чарадзеем сяньня музыкант:
быццам сонца віпіўшы сьмяецца,
на цымбалы спусьціцца рука
і заменіць струны ў белы вецер.
І шуміць той вецер каля ног
ўсё вышэй мяцелючы спадніцы,
аж пакуль падлога і парог
звонкім полымям не загарыцца.
А дыхне на плечы і вышэй: —
адзавуцца песьні ройна, густа,
васількі пасыпяцца з вачэй,
з пад узорных, паркалёвых хустак.

У прыўне цішэй.
Сказы рвуцца, як ніткі, і чутна,
як пра дальнія весткі говора Сілаш.
Ўжо сывараткай пацямнеўшай змрок цэдзіцца мутна
праз ваконныя шыбы.
— Што-ж добрага ў вас?..
І хлынуў праз вусны засьмягшыя жаль пержыты,
чырвань — з ранаў, якіх не зацішнеш рукой;
устала жыцьцё з ніў, зімы малачаем прыкрытых,
зашумела у жытніх славох галаўнёй.
Падпёршы шулу маладзіцы ў кутку гаварылі.
Перабралі пасажную скрыню, сватоў.
— Дыван адзін новы, — ўздыхала салдатка Марыля —
сама бачыла, ў восем ці ў дзесяць нітоў, —
і зрэб'я труба...
Пелі посьле. То зноў уздыхалі:
што на полкі танкога няма палатна,
што Зосю бяз даўных варожбаў вялі, спатыкалі
і што плакала трохі замала яна.
За печ нехта лез ў кажуху скамарохам кудлатым.
Піск дзяўчат, шум,
раскацісты сьмех за сталом;
разставіўшы полы з услону, на цэлую хату
галасіста пяяў Перабрspringрод пятухом.

Адгарнуў чупрыну музыкант
з полымям вячэрняга загару
і лязом сярэбраным смыка

перавёў па струнах і ударыў.
А другі, як Нёман, расьцягнуў,
завірыўшы сінь басоў, баяна
і запеў пра моладасьць-вясну,
што шуміць з вятрамі над бур'янам.
І напеў праціснуўся з сяней
і паплыў акрылены над Логам,
дзе ярчэй у змроку і ярчэй
расьцьвітала млечная дарога.

Агарак лучыны дыміць пахам бору—жывіцай,
быццам ноч разьвіваецца дымам з матка.
У чалесьніку тлее вугольле Мядзьведзіцай, Сіццам;
льлецца месяц з кужэльных махроў ручніка.
Паўзе па іконе прусак ці мо' іншая мошка.
Сьвяты зморшчыўся, быццам сабраўшыся чхаць,
ды страх разбудзіць тых, што дрэмяць-ня дрэмяць у ложку
і на лавах змарыўшыся покатам сьпяць.
Маўчыць чудатворац. За посьцілкай шопатам голас.
— Не храпі так, Сымон, а то нельга заснуць.
Казала, — ня пі... ды прачніся... З каленяў ты голых,
чуеш, коўдру сьцягнуў... Ціха ў цёмную муць
славы ападаюць: — Эх, бабы!.. Ну што табе трэба?..
Засыпаючы, зноў храпе глуха Сымон.
А посьле на вочы здаецца спусьцілася неба
і Сілаш не пачуў, як прыблізіўся сон.
Прысьнілася вырай: ляціць стада дзікае качак;
дзед Сьцяпан папраўляе вясеньнюю снасьць;
нясе вецер з поля журботнае водгульле, — плача
расой сьлёз незасееная цаліна...
Збудзіўся... За посьцілкай чуюцца ціхія ўсхліпы.
Зосі плач дзіўным страхам праймае ўсяго.
Мо' выйсьці?..
Завесы дзьвярэй адклікаюцца скрыпам.
Рэдка ў шыбах замерзшы мігае агонь.
Другі канец хаты вясельлем яшчэ ўсё буяніць.
На дварышчы мінуў Сілаш коняй, вазкі.
Ляжыць у адным Перäброд, абымаючы сані
сьпіць асаднік разхрыстаны.
А з-за ракі,
сьвітаючы, сьнежныя стружкі нясе вецер полем —
і прыемна іх шолах кладзецца ля ног.
Вобраз Марты ўстае... І чаму ў гэтым сьнежным прывольлі?
Тут ня гэта заносіць мяцельная ноч!..
Далёка ўздымаецца дымам сінеючым золак, —
плыве, гораў мінае круты перакат.
Тады Сілаш бача: ля жэрдзяў гнілых частаколу
незамецены ласіцы сьлед ці шашка.

СЯРГЕЙ ХМАРА

Бо такое жыцьцё

Коціцца апокаліптычны валец па зямлі, мяжджучы людзкія грудзі. Крывавы сьлед значыць ягоны шлях.

— — — — — — — — — — — — — — — —

...Між лукаватага, сярэднявечнага скляпеньня агромнае, хмурае залі, пры мглявым сьвятле дзьвёх лямпак, рвецца, дрыгае ў агоніі нейкае аграмаднае тулава дапатопнае фантастычнае патворы...

Сіне-зялёны гмах вылазіць з закуцін. Пяцьсот голых цел са ўскінутымі ненатуральна ўверх рукамі, у глухой цішыні зьбітыя ў густую масу, тварамі да муру, вядуць макабрычныя скокі. Пяцьсот пар босых ног, падняўшыся на цыпачкі, перабіраюць на месцы ў неаканчальным шалёным бегу, шорах соцен босых ног зьліваецца ў нейкую страшлівую музыку—ў шопат, шопат сьмерці. Студзеным крылом кружыць яна над дрыгаючым, вывіваючымся ў цішыні скрутам жывых целаў. Заміраючы ў зьнямозе, рытм звар'яцелых скокаў прахватвае электрычнаю іскрай раптоўна вырваўшыйся зьнекуль крык болю — упадак голага цела на бэтон. За горла хапаюць нявідомыя капцюры, у звар'яцелым тэмпе рвуцца зьнямелыя целы ў крывавым тумане.—Шалёны вір.

Над сьветам пануе панурая, чорная ноч.

— — — — — — — — — — — — — — — —

...Адзінокая кропля недзе са стропаў звонка звоніць у куце аб бэтон падлогі. Кожная кропліна балюча ўверчываецца сьвідрам у мозаг.

Цемра. Вечная ноч. Колькі яна ўжо цягнецца?

Тыдзень? А можа месяц? А можа ўжо год?! — Калі гэта было?..

...Бразнулі замкі масыўных дзьвярэй. Дыхнула магільнаю вільгацьцю. Адазваліся рэхам пад скляпеньнямі адыходзячыя шагі...

Цемра.

Нецярпіма смокча ў грудзёх голад. Парэпалі перасохшыя вусны. Рукі сьмела шараць, мацаюць перад сабой. З усіх бакоў цагляныя, сьлізлыя з вільгаці, сьцены. Пальцы ашчупваюць выскрабаныя няведамым словы: Ба-рацьба!

Капае звонячы аб бэтон капля. Холад студзенымі лапамі, клешчамі ўшчаміў за плечы, за ногі, за рукі. — Бегаць! Бегаць! Сагрэцца!—У цемры абступілі навокал сьцены. Выцягненыя рукі няўпынна ўпіраюцца ў вільготную цэглу. Бегаць! — Што гэта? — Пухнуць рукі. — Замярзаю! Каб хоць адрабінку цяпліні! Чырвоныя колы ў вачох.—Руху! Руху! Руху! Гімнастыку!!—Не хапае паветра. А холад вяртае! Шалёны, жга-

ючы голкамі холад. — Слаба! Легчы-бы, скруціцца ў ком, ратуючыся ад холаду, — адпачыць... Мокры бэтон цераз сарочку—раскаленым жалезам. Ад сьцісканьня — каб не звалілі ў дрыготцы зубы — баляць, ныюць ськівіцы. — Руху! Цягне голаў у ніз сон. Вось прысесьці на кортачкі апёршыся аб сьценку і заснуць. — Зьмійкамі сочыцца вільгаць у хрыбет. Паволі надыходзіць забыцьцё.

Грук. Быццам валіцца цэлы мур. І вусны з прасонак самі дзіка крычаць: ёсьць! — Паволі надыходзіць сьведамасьць. Звоняць недзе адыходзячыя шагі. І зноў паўзабыцьцё, паўсон. Холад — круціцца ў галаве. Недзе капае звонячы аб бэтон капля.

— Скуль гэта такі запах?! — Гэта пахне вішнёвы цьвет. Не! — Гэта пахнуць сьпелыя вішні! Ведаеш: буйныя, чорныя вішні! Цэлыя кошыкі вішняў!

... Сьвеціць сонца. Як прыемна падставіць свой твар пад пяшчоту сонечных косаў!

...Хто гэта?! Хто гэта?! — Наташка! — Ты??! Но але, яна! Бычыш, а мне здавалася, што ты далёка, далёка...

Пачакай! Пачакай! Дай прыпомню! Ага! Гэта было начой! Прышлі ў хату... Чужыя... Варожыя. Ты плакала...

Ха-ха-ха-ха! А гэта-ж быў толькі сон! —

Чаго-ж ты маўчыш? Наташа! Наташа!!! Чуеш, як пахнуць вішні? Нарвём зараз цэлае бярэмя цьвітучага гальля. Ты-ж так любіш краскі! Хадзі да мяне! Пацалуеш. Ведаеш, гэтак патвойму — ў вочы.

Чаму гэта сонца так паліць? Не, гэта-ж ня сонца. Агонь!

А дзе-ж Наташа? Наташа!!! Хто гэта крычэў?.. Я сам?.. Ву-у-у-у, як холадна!

Цемра. Капае капля. Не! Гэта-ж ня капля! Гэта даўбуць у муры. Но, але! Даўбуць кіркамі. Во, во! — гэта яны! Прышлі разьбіць, разбурыць гэты праклятый, магільны склеп.

Думалі, — возьмеце?! А як-жа!

Што-ж гэта? Чаму мая рука такая цяжкая? А дзе-ж мае ногі?

Ноч. Праклятая, бязконцая ноч! Вірыць, вірыць, вірыць.

— — — — — — — — — — — — — — — — — —

... Рве кашаль грудзі раськідваючы навакол чырвоныя крапліны крыві. Апошнім высілкам схапіліся рукі за шнур. Раз-два-тры-чатыры!.. Раз-два-тры-чатыры. Дзесяцітановы валец — волат мерна коціцца па ўсыпанай жарстве дарогі. Набрыняла ад натугі, пасінела аблічча. Вачамі празірае шэры, няпрытомны жах.—Дацягнуць! Каб хаця ня ўпасьці! Адно—ня ўпасьці! Плыве з вуснаў хрып агоніі.

Раз-два-тры-чатыры... раз-два-тры-чатыры...

— — — — — — — — — — — — — — — — — —

...Коціцца апокаліптычны шалёны валец па зямлі, мяжджучы людзкія грудзі. Крывавіць след.

— — — — — — — — — — — — — — — — — —

Між калючых, драцяных засекаў прарвалася да неба зялёная, кучаравая бярозка. Прарвалася і зашумела, вітаючы вясновае сонца.

Падняў голаў. Небам к поўначы ішлі журавы. Блiснулі вочы, быццам гаварылі: — А ўсё-ж такі вярнуліся! Вытрывалі! А ўсё-ж такі ідзе вясна! Ідзе!.. Бо такое жыцьцё, такое права Зямлі!

Рыбакі

Ціха гойдаецца на хвалях возера шкабара.[1]) А на беразе шумяць ціхутка аб нечым жарсьцеліны.[2])

Замёр з восьцямі ў руках у шкабары Архей.[3]) Ледзь-ледзь парушвае долькаю[4]) седзячая ззаду Палая.[5]) Сьвіснулі раптам восьці і забілася на сталёвых зубох серабро рыбяй лускі.

І зноў настарожыўшыся над вадой бліскаюць, шчэрацць свае сталёвыя клыкі восьці. І зноў удар. І зноў цішыня.

Ціха гойдаецца на хвалях шкабарына.

— — — — — — — — — — — — — — — —

— Ну годзі! На сёньня хопіць! Кіруй Палая да хаты наш карабей.[6]) Смачны будзе квас[7]) увечары! — цешыцца Архей.— Во якія штукі!

— Украніқаў[8]) напяку — марыць Палайка.

Вось і бераг. Трывожна нечага шумшырацць[9]) жарсьцеліны.

— — — — — — — — — — — — — — — —

— Ну, давай сюды восьці й рыбу! — бразнула раптам начальніцкім тонам за плячыма Архея.

Як-бы пераеханы батугом[10]), рвануўся ў бок Архей. Перад вачыма яго вырас суд—вастрог. — «за клюсаўніцтва».[11])— З-заду астаўся енк Палаі і даганяў яго тупат ног, пагрозьлівыя крыкі: «стой!» Лопнуў разьбітым гаршком ў азыраватым[12]) паветры выстрал. Заплакаў недзе над вухам сталёвы авадзён.

Архей бязцямна падганяны акрыкамі і стрэламі бяжаў.

---

1) Шкабара — палескі дыялект: човен з аднаго пня.
2) Жарсьцеліна — род балотнай вербы.
3) Архей — імя — Архіп.
4) Долька — вясло.
5) Палая — Палагея, Палягія.
6) Карабей — карабель.
7) Квас — тут, разумеецца, рыбная юшка.
8) Укранікі — бонды, печаныя на патэльні з ікры з мукой.
9) Шумшырацць — шумяць.
10) Батуг — бізун, пуга.
11) Клюсаўніцтва — браконьерка.
12) Азыраваты — сыры.

— Вось каб толькі даскочыць да вербалозаў, да альшняку! — тады ня поймуць.[1])

Раптам ударыла нешта цёплае ў плечы, прайшло маланкаю-агнём па целе падкошваючы паджылкі ў нагах. Закруціліся ў вачох вербалозы, неба. Забіўся аб зялёную мураву, быццам раненая рыба аб дно чайкі, Архей. Зачырванела пасокай[2]) трава. Пэрламі сьлёз зіхацелі на недалёкай пагоні[3]) альшняку крапліны расы. На небе йграў рознаколерны смок.[4])

Ціш. Толькі ў прыбярэжнай жарсьцеліне шапоча аб чымсь палескі вецер. — Вышчырылі восьці свае гострыя клыкі. Ледзь-ледзь калыхаецца на хвалях шкабара.

Запеніцца раптам вада пад ударам васьцей. Блісьне ў паветры серабро лускі.

І зноў цішыня...

Рыбакі робяць сваё, каб мець хлеб, каб магчы жыць...

А возера аболіць[5]) беднай, загнанай вёсцы.

М. КРЫВІЧ

Будучыні

У мляўкае сэрца, прыскамі зораў,
новыя сілы ганю,
невадам песьняў з сіняга мора
вылаўлю вязкі агню.

Сонны калісьці, можа і кволы,
сёньня з крыльмі палячу!
Волю бунтарную, сэрцавы порах,
сыпнуць завеяй хачу...

Музыкі трэлі, звон цымбалісты,
быццам прадвесьне вясны.
Эх, развіхрыўшы сэрца, вагніста,
жару мятуць курганы.

Песьні! Пад белаю, буйнай чупрынай
Чуць: ужо годзе цяснот!
У дальныя глыбі, музыкай сіняй,
Маторны рыхтуйце палёт!

1) Поймаць — злавіць.
2) Пасока — кроў.
3) Пагоня — порасьць.
4) Смок — вясёлка.
5) Аболіць — зычыць, спагадае.

* * *

Часамі сумна быць паэтам
у нашы дні, як ў цёмным боры,
дзе сплыла кроўю на палетак
ўся моладасьць зары з задорам.

Ды не таму, што на рабіне
асыпаўся ўвесь жар караляў, —
што некаторых погляд стыне
ў задымчывых тугою далях...

Але калі павее вецер
і хмары ў далях тых затопе, —
я прынясу пахучых вецьцяў
і пасаджу на чорны попел.

Сон

Мяне на полі сон змарыў.
І гусьлі гралі — струны-межы
і з тонкім звонам камары
на пах зьляцелі крыві сьвежай.

І мне прысьніўся сон такі:
што быццам я ля Гвадарамы
пасьля змаганьня на штыкі
прапаласкаў рубцы і шрамы.

І пасьля доўгіх перамог
паплыў туды, дзе край сінее,
і скінуўшы сваё ярмо
ступіў на Новую Гвінэю...

І вось — прачнуўся на мяжы:
крычалі конікі аб нечым,
і нечакана перажыў
яшчэ адзін галодны вечар.

* * *

Апошнім шолахам скрываўленыя раны
хацела ліпа ўчора патушыць.
Ды пасьпяшыў з усходу сьвежы ранак,
сарваўшы нешта цяжкае з душы.

І мо таму заселянелі нівы
на полі мяккім полымям вясны,
а па садох малочныя узрывы,
ну проста — казка, хоць прысьні!

І не чакаў я больш чароўных гукаў,
што мне прарочыў з вечара прыліў,—
мяне ізноў цягнула ў даль разлука
да той схвалёванай ральлі,

дзе змыўшы пот з сінеючай дубровы
прыдзецца часам смачна адпачыць,
дзе сонца паліць залатыя бровы,
цяжкія зьняўшы шолахі начы.

Пад ранак

Неяк марудна ў павуціну
зьляталі згубленыя зоры,
дзе вечар наміткаю сіняй
накрыў апошнія узоры.

Ў такую ноч люблю паслухаць,
як сьцежкі ў полі заміраюць
і толькі часам звоніць глуха
над рэчкай асака густая.

Вясёлай раніцай

Вясёлай раніцай цьвіце
расою вымытая рута.
Парву я тысячы ніцей,
што лучаць з горкаю атрутай.

Як палахлівыя да дня
згарну рукамі страхі-цені
тады з паўночы на паўдня
зьбяру я зоры-лятуценьні.

ЯНКА КУПАЛА

Тарасава доля

Памяці Тараса Шэўчэнкі

(З нагоды 125 угодкаў нарадзін песьняра)

2

Як раджала яго маці, —
Не сьвяцілі зоры,
Зубы скаліла няволя,
Хіхатала гора.

Песень радасных, вясёлых
Над яго калыскай
Не сьпявалі маладухі
Ні здалёк, ні зблізку.

А як вырас, як падняўся,
На свае стаў ногі, —
Сьледам—паншчына, батрацтва,
Панскія парогі.

Крукам гнуўся перад панам,
Уздыхаў нясьмела,
Катавалі батогамі
Юнацкае цела.

Энгельгардты, Энгельгардты!
Ўжо вам не паўстаці, —
Адамсьціла Украіна
За дзяцей і маці.

3

А было ў тыя часіны
Цёмна, бы ў магіле,
Людзі гінулі, як мухі,
Ці, як здань, блудзілі.
Ні сьвятла таго, ні ўсьмешкі,
Хоць-бы на хвіліну.
Ночка хутала Украіну,
Ці-ж толькі Украіну?!
І скрыпелі, і бражджэлі
Ланцугі наўкола;
Панства людам гандлявала,
Як нямой жывёлай.

Прадавала і мяняла,
Ў карты прайгравала;
Крыві, сьлёзам канца-меры
Бядняцтва ня знала.
Гэткай катаргі і мукі
Пяром не апішаш.
Прамінула. Толькі думку
Успамін калыша.

4

Нарадзіўся на сьвет белы
І Тарас у путах,
А ня лёгка, ой, браточкі,
Змалку быць закутым!

Я таксама нарадзіўся
Ў ланцугах пад царам.
Спапяліў-бы ту часіну,
Каб я мог, пажарам!

Прайшлі годы. Тарас вырас,
Як таполя ў полі.
Выкуплялі добры людзі
Тараса з няволі.

Як браў грошы пан вяльможны
Рукою паганай,
Кроў блішчэла на дукатах,
Кроў людзей скаваных.

Кроў скаваных бацькі, маці,
Скованага сына,
Кроў блішчэла на дукатах
Скутае Украіны.

5

Па гасьцінцы беларускім,
Ў Пецярбург з Варшавы
За карэтаю, за панскай
Пхнецца хлопец жвавы.

Гэта йдзе Тарас-нявольнік,
Служка ясьне-пана, —
Пан у золаце, ён — бедны,
Босы, абарваны.

Беларускія бярозы
Абапал гасьцінца
Калыхалі думкі шумам
Хлапчуку-Украінцу.

Бор шумеў яму над вухам,
Булькалі крыніцы, —
Маладому, дасьціпному
Было чым дзівіцца.

Бачыў убогія хаціны,
Крытыя саломай,
Людзей бачыў паднявольных,
Што і ў сябе дома.

6

Чаму ў сэрцы беларускім
Песьня Тарасова
Адгукнулася, запела
Зразумелым словам?

Чаму вецер з Украіны
З думкаю крылатай
Далятаў да Беларусі
І шумеў над хатай?

Бо йшла доля Беларуса
З доляй Украінца
Аднолькова ў поце, ў сьлёзах
Церневым гасьцінцам.

Бо зьгіналі аднолькова
Змалку да скананьня
Шыі ў ёрмах і чакалі
Яснага сьвітаньня.

Як жылося, як вялося,
Як марнелі сілы,
Таму сьведкай там і тутка
Курганы, магілы.

8

Хто-б падумаў, здагадаўся,
Што ў такіх аковах
Быў Тарас багаты скарбам,
Скарбам адмысловым.

Ні цары, ні іхні слугі,
Ні паны, ні каты
Не маглі забраць, украсьці
Гэты скарб багаты.

А была яго багацьцем,
Скарбам нябывалым,
Была песьня, што з-пад сэрца
На сьвет вылятала,

Не танула песьня ў моры,
У агні не гарэла,
Закаваць ня мог у путы
Сатрап азьвярэлы.

Маляваў ён і малюнкі,
Дык як сіл ні траціў,
Не ўдалося у няволі
Шчасьце змаляваці.

9

І ня сьпіцца, і ня сьніцца
Тарасу на сьвеце,
Дзе ні гляне—скрозь няволя,
Плача маці, дзеці.

Украіна пад пагамі,
Пад жандарам-царам
Сіратою стогне, гіне
У жудкіх думах, марах...

Усю крыўду, катаваньне,
Што душыла грудзі,
Выліваў ён на паперы,
Каб ведалі людзі.

Заклікаў да лепшай долі,
Долі і свабоды,
Клікаў шчасьце, клікаў сонца
Для свайго народу.

10

Пайшло слова Тарасова
Горда, непакорна, —
Знайшла водклік яго песьня
У людзей прыгонных.

Людзі вочы праціралі,
Выглядалі волі.
Тарас праўду нам сьпявае, —
Сьпявай-жа, брат, болей!

А цара, яго прыдворню,
А паноў крывавых

Агарнуў страх ад такое
Бунтарскае зьявы.

Думу думалі, як лепей
Тараса караці,
Ці на полі, на кургане,
Ці ў бацькавай хаце.

І каралі яго карай,
Каб нямым зрабіўся,
Каб складаці свае песьні
Навек адвучыўся.

11

Ой, шлях катаржны ня лёгкі,
Вытаптаны горам,
Косьцьмі людзкімі усланы,
Вымыты сьлёз морам!

Павяла па ім, халодным,
Тарасова доля
Цераз пушчы, цераз нетры,
Праз пустое поле.

Адзінока. Гукнуць спробуй —
Не пачуеш рэха,
Толькі зьвер падчас завые
Ашалелым сьмехам.

Ой, загнаў цябе, Тарасе,
Подлы цар — душыцель!
У труну злажыў жывога,
Каб ня думаў жыці.

Тарасова гора, мукі
Камень толькі бача,
Ды шумлівы вецер чуе,
Як гаротны плача.

12

Крэпасьць Орская—астрогам
Ды з царскім указам —
За пяро каб і за пэндзэль
Ня браўся ні разу.

Каб ня браўся і ня думаў
Дум сваіх крамольных.
Во, якую панёс кару
Пясьняр паднявольны!

А сны сьняцца аб радзіме,
Аб стэпе мурожным, —
Маляваў-бы хоць крывёю, —
І крывёй ня можна.

Думкі лезуць, выліваў-бы
Думкі на паперы, —
І нявінную паперу
Адабралі зьверы.

Чахне, сохне, адарваны
Ад роднае нівы,
Пад салдацкай царскай палкай
Тарас нешчасьлівы.

13

Такой кары акаяннай
Не жадаў нікому!
Павяртаў Тарас з няволі
У няволю дадому.

Зьела царскае караньне
Тарасову сілу, —
Менш глядзеў ужо на неба,
Болей на магілу.

Адно песень, песень гулкіх
Не забыў складаці,
Не забыў у песьнях-думках
Украіну-маці.

Мо' пісаў-бы свае думы
Ён крывёй і далей,
Але з жылаў яго каты
Кроў павыпівалі.

Ласа высмакталі гады
Яго кроў з-пад сэрца.
Хай-жа памяць гэтай крыўды
Навек застанецца!

14

І памёр Тарас. Няволя
З горам даканалі.
Зашумелі сумна-сумна
Дняпровыя хвалі.

Паплылі Дняпровы хвалі
Ажно ў сіне мора.
Хай гавораць хвалі сьвету
Аб вялікім горы!

І заплакала Ўкраіна, —
Плакала ня мала,
Як хавала свайго сына,
Песьняра хавала.

Насып сыпалі высокі
Панад Днепрам сінім,
Каб відаць было далёка —
Па ўсёй Украіне.

Сьпіць Тарас, адпачывае
Ў вёсны і прадвесьні.
Ня сьпіць толькі між людзямі,
Ня сьпіць яго песьня.

Менск, 27.II.39 г.

АД РЭДАКЦЫІ: Твор „Тарасава доля“ Я. Купалы надрукаваны ў менскім часапісе „Літаратура і Мастацтва“ № 12, з дня 3.III.1939 г. Складаецца ён усяго з 15 частак. Зразумела, не перадрукавалі з іх тых частак, якія выражаюць актуальныя палітычныя мамэнты.

Бачым з перадрукаванага матарыялу, якую яркую і трапную характарыстыку долі украінскага і беларускага народу на грунце сацыяльна-палітычных адносінаў у пару жыцьця Тараса Грыгоравіча Шэўчэнкі, жыцьцёвы шлях, характарыстыку і значэньне літаратурнай дзейнасьці гэтага геніяльнага украінскага Кабзара даў нам народны паэт Янка Купала.

ЯКУБ КОЛАС

Баяну-Кабзару

У тваіх вачах
Двух глыбозных, як неба, крыніцах,
Я чытаю шлях,
Багатырскі ўзмах
У вышыні, дзе сьвецяць дзяньніцы.

Ты прайшоў яго,
Як асілак-змагар непахісны,
І агню твайго
Не заліў ніхто —
Сам упаў твой тыран ненавісны.

І расьце адзін
Пустазёл на магіле тырана,
Пра яго ўспамін —
Горкі дым, палын
І страхоцьце пустога кургана.

А ты жыў, Кабзар,
І жывуць твае песьні на сьвеце,
І табе, пясьняр,
Зносяць слова ў дар
Твае... ўнукі і дзеці...
— — — — — — — — — —

У яго вачах,
Двух глыбозных, як мора, крыніцах,
Я чытаю шлях
І арліны ўзмах
У прастор, дзе гарэць зараніцы.

(„Літаратура і Мастацтва", № 11, 27.III.39.)

Я. ШУТОВІЧ

Вялікі украінскі паэт

(з нагоды 125 гадаўшчыны ад дня нарадзін Т. Г. Шэўчэнкі)

9 сакавіка (25 лютага ст. ст.) 1939 г. мінула 125 год ад нарадзін слаўнага ўкраінскага кабзара — Тараса Грыгоравіча Шэўчэнкі. Братні нам украінскі народ кожны год аддае свайму вялікаму сыну чэсьць — у друку, на асобных урачыстасьцях, акадэміях. Сёлета ўгодкі нарадзін паэта асабліва ўрачыста адзначаліся, і ня толькі самымі Украінцамі, але ўсімі народамі, якія шануюць і ўмеюць шанаваць памяць вялікіх людзей.

І беларускі народ памятуе аб вялікім сыне ўкраінскай зямлі. Па той бок рыскай мяжы, у Савецкай Беларусі, па многіх местах і сёлах, у чэсьць ягоную арганізаваліся ўрачыстыя акадэміі, вечары, беларускі савецкі друк адзначыў угодкі слаўнага Шэўчэнкі адпаведнымі артыкуламі, беларускія савецкія пісьменьнікі — Купала, Колас, Бядуля, Ушакоў, Клімковіч і інш. — к дню юбілею пераклалі на беларускую мову збор вершаваных твораў Шэўчэнкі «Кабзар», які выйшаў з друку ў колькасьці 10 тысяч экзэмпляраў у вельмі харошым выданьні Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва, кампазытары БССР напісалі каля 30 твораў на тэксты вялікага ўкраінскага паэта, арганізаваны выстаўкі, у асобнасьці вялікая менская выстаўка літаратурных, ілюстрацыйных і іншых матарыялаў, прысьвечаных памяці Тараса Шэўчэнкі.

Адзначым і мы гэтым артыкулам памяць геніяльнага Украінца.

* *
*

Тарас Грыгоравіч Шэўчэнка нарадзіўся й жыў у тым часе, калі на Украіне й у іншых краёх, у тым ліку й у белару-

скім, існавалі жорсткія палітычна-сацыяльныя адносіны. Палілітычны царскі рэжым з аднаго боку, а лютая паншчына — з другога боку ўзваліліся ўсім сваім цяжарам на міліённыя народныя масы. У варунках такога грамадзка-палітычнага ладу жыцьцёвы шлях Шэўчэнкі быў пакутны й жорсткі.

Нарадзіўся паэт у беднай сям'і прыгоннага селяніна, якая належыла багачу-абшарніку Энгельгардту, — у сяле Марынцах, Зьвенігародзкага пав., Кіеўскай губ., дня 9 сакавіка 1814 г.

Ужо з дзяцінства будучы паэт дазнае многа гора. На 9-тым годзе жыцьця ад непасільнай работы на паншчыне памірае яго матка, а бацька жэніцца другі раз. Ад мачыхі, якая аказалася злой жанчынай, малады Тарас дазнае многа прыкрасьцяў і зьдзеку. Адзінай асалодай для яго былі дзьве сястрыцы — старшая Кацярына, якой пазьней прысьвяціў аднайменную паэму, і малодшая Ірына; яны цёплымі, сардэчнымі адносінамі абдаралі свайго брацíка. Бацька памёр, калі Тарас меў 12 год.

Прагу да навукі й малярства адчуваў з дзяцінства. Бацька разумеў гэта й Тараса аддаў на службу й на пачаткавую навуку да вандроўнага настаўніка дзячка, які аказаўся п'яніцай. Ад гэтага настаўніка, як і ад другога, нейкага Бугорскага, у якога ён прабыў 2 гады, — працярпеў Тарас шмат бяды й зьдзеку. Аб другім настаўніку ў сваім аўтобіографічным пісьме піша Тарас гэтак: «Гэта першы дэспат, на якога я наткнуўся ў маім жыцьці, усяліў у мяне на ўсё жыцьцё глыбокую агіду й пагарду да ўсякага насільля аднаго чалавека над другім»... І Тарас ня выцярпеў зьдзекаў гэтага дэспата й уцёк ад яго.

Пасьля няўдалых стараньняў знайсьці настаўніка маляваньня, Т. Шэўчэнка 15-гадовым хлапцом апынуўся ў ліку дворнай чэлядзі свайго памешчыка Энгельгардта, гдзе быў спачатку на службе ў кухні, пазьней — «казачком» у свайго пана; да абавязкаў «казачка» належалі паслугі пану, — падаваньне вады, люлькі, запалак і т. д. Незадоўга Тарас пакінуў родную Украіну й разьяжджаў із сваім панам па Польшчы, Беларусі. Быў таксама й у Вільні... Ад гэтага пана таксама перажыў Тарас шмат зьдзеку...

У 1831 г. Энгельгардт разам з Шэўчэнкам прыяжджае ў Пецярбург, гдзе ў наступным годзе, на просьбу Тараса, пан закантрактаваў яго на 4 гады цэхаваму маляру Шыраеву, які аказаўся ў адносінах да Шэўчэнкі таксама нягоднікам, як і папярэднія настаўнікі-дэспаты. Тайком, часамі, уцякаў Тарас ад свайго новага настаўніка, каб у Летнім садзе намаляваць копіі із шматлікіх статуяў.

У гэтым садзе, на шчасьце, ён спаткаўся із сваім земляком Сашэнко, студэнтам Акадэміі Мастацтваў, які яго й уцяг-

нуў у інтэлектуальнае й паступовае асяродзьдзе паўночнае сталіцы.

Сьветлыя, паступовыя адзінкі з гэтага асяродзьдзя, першым чынам рускі пісьменьнік В. А. Жукоўскі, пазналіся на творчае душы Тараса Шэўчэнкі, на ягоным таленце, выкупілі паэта й мастака з панскае няволі, заплаціўшы Энгельгарду 2.500 рублёў. Гэта сталася 5 мая 1838 г., калі Тарас Шэўчэнка меў 24 гады.

Яшчэ будучы ў няволі, у Пецярбурзе Тарас Шэўчэнка дзякуючы гэнаму інтэлектуальнаму асяродзьдзю крыху вучыўся мастацкіх навук, а па вызваленьні з няволі ўступае ў гэным-жа Пецярбурзе ў Акадэмію Мастацтваў. Апроч фаховых мастацкіх навук, прадметам зацікаўленьня й вывучэньня зьяўляюцца для яго літаратура, гісторыя, а нават грамадзка-эканамічныя навукі. У 1845 г. скончыў Акадэмію й атрымаў годнасьць свабоднага мастака.

Да часу пабыту ў Акадэміі адносяцца яго першыя, дайшоўшыя да нас паэтыцкія творы: 1838 — „Причинна“, „Витре буйный”, „Тече вода в сине море“ і інш., у 1840 г. выходзе першае выданьне яго вершаў „Кабзар”, які зьмяшчае: „Думи мои“, „Перебендя“, „Тополя”, „Тарасова ніч”, „Катерина“ і інш. Тагачасная расейская крытыка ў Пецярбурзе, між іншым і ведамы Белінскі, творы Шэўчэнкі спаткала з насьмешкай, а самога аўтара пагардліва назвала „мужыцкім паэтам”. — Шэўчэнка, пэўнеж, не збаяўся гэтага й далей пісаў творы ў „мужыцкім духу”.

У 1841 г. выходзе гістарычная паэма „Гайдамакі", накіраваная супроць абшарнікаў, у 1842 г. піша ў рускай мове драму „Никита Гайдай“, паэму „Слепая”, у украінскай мове — паэму „Гамалия“.

Туга па Бацькаўшчыне мучыла Тараса Грыгоравіча. Ён хацеў паехаць на Бацькаўшчыну адразу па выкупе з няволі, аднак гэтае хаценьне мог зьдзейсьніць толькі ў 1843 г. — пасьля 15-ці гадовага прабываньня на чужыне. У гэтым годзе ён на кароткі час адведаў сваю родную вёску, а так-жа іншыя мясцовасьці роднай Украіны, гдзе бачыў ранейшую нядолю свайго народу ў паншчыным ярме. Па прыезьдзе ў Пецярбург піша чарод новых твораў, у тым ліку й ведамую сатыру на дзяржаўны манархічны лад „Сон” (1844), зьбліжаецца з падпольнымі рэвалюцыйнымі арганізацыямі й чытае нелегальную рэвалюцыйную літаратуру.

Другім разам едзе Шэўчэнка на Украіну ў 1845 г. на даўжэйшы час. У Кіеве дастае пасаду мастака пры кіеўскай Археолёгічнай Камісіі й з даручэньня гэтай Камісіі робіць экскурсіі па Украіне для маляваньня памятак старасьвеччыны. У гэтым часе піша ён чарод знамянітых твораў — „Еретик”, „Суботтов“, „Кавказ”, „Послание”, „Заповит“, „Давидові псал-

ми" і інш. і паводле ведамасьцяў сучасьнікаў беспасрэдна агітуе сялянства супроць паноў і цара.

У 1846 г. у Кіеве арганізуецца ведамае тайнае Кірыла-Мяфодаўскае таварыства, з сваімі ідэямі агульнаславянскага братэрства й народавольства. У радох сяброў т-ва знаходзяцца й ведамыя Кастамараў, Куліш, Савіч. Да т-ва прыступае й Шэўчэнка. У выніку даносу ўлады арыштоўваюць сяброў т-ва, а ў тым ліку 18 красавіка (н. ст.) 1847 г. і Шэўчэнку. Усіх, апроч Шэўчэнкі, караюць высылкай, на адносна кароткія тэрміны, у розныя куткі Расеі. Арыштаванага Шэўчэнку спачатку накіроўваюць у Пецярбург і садзяць у каземат III аддзелу, а ў чэрвені 1847 г. высылаюць на вечна ў азіяцкія Орэнбурскія стэпы, у Орскую крэпасьць у салдаты, з засьцярогай, што ня мае права там ані пісаць, ані маляваць,—такую забарону ўласнаручна падпісаў цар. Гэта была помста цара першым чынам за некаторыя творы паэта — сатыру „Сон", „Кавказ" і інш.

У новай няволі цяжка жылося паэту. Але хутка аблегчылася яго доля. Яму ўдаецца, з дазволу ваеннага начальства, пакінуць крэпасьць і выехаць разам з навуковай экспэдыцыяй на Аральскае мора. Тут, паміма таксама цяжкіх умоў жыцьця, паэт мае ўжо магчымасьць пісаць і маляваць, тут не хадзіў ён на муштры, не цярпеў зьдзекаў ад вайсковай улады. На працягу 1848—50 г.г. напісаў Шэўчэнка даволі значны лік рэвалюцыйных па размаху й сіле большых твораў: — «Княжна», «Іржавец», «Варнак», «Царі», «Маріна», «Чумак» і інш., — і многа малых; напісаў таксама некалькі аповесьцяў у рускай мове: «Музыкант», «Несчастный» і інш. Але вярнуўшыся з экспэдыцыі, у выніку даносу на Шэўчэнку ў тым, што ён, паміма забароны, малюе й піша, яго ўвосені 1850 г. накіроўваюць у самую глухую Нова-Петрапаўлаўскую крэпасьць, у якой прабыў паэт пад суровым наглядам доўгіх сем гадоў — ад 1850 да 1857 г. З гэтага часу ведамы толькі адзін верш, у якім Шэўчэнка адклікаецца на Севастопальскую вайну.

Амнэстыя для палітычных, якую даў цар Александар II у 1856 г. з нагоды свайго ўступленьня на трон, не ахапіла Шэўчэнкі. І толькі дзякуючы перадавым культурным дзеячом, на чале з віцэпрэзыдэнтам Акадэміі Ф. І. Талстым, якія хадайнічалі перад царом у справе амнэстыі для Шэўчэнкі, — Тарас Грыгоравіч атрымаў свабоду. 15.V.1857 г. ён сваімі таварышамі быў павядомлены аб гэтым, а толькі 15 жніўня, не дачакаўшыся афіцыяльнага загаду, быў звольнены. З крэпасьці накіраваўся праз Астрахань і Ніжні-Ноўгарад у Пецярбург. У Ніжнім-Ноўгарадзе паліцыя загадала яму аставацца й толькі праз шэсьць месяцаў дазволіла паехаць у сталіцу. У Пецярбурзе Шэўчэнка ўтрымлівае кантакт з рэвалюцыйным асяродзьдзем (Чэрнышэўскі, Серакоўскі), піша новыя, сільныя,

насычаныя рэвалюцыйным гневам, творы — «Неофіт», «Юродивый», «Доля», «Муза», «Слава» і інш.

У 1859 г. Шэўчэнка выяжджае — апошні раз!—на Украіну, гдзе яго арыштоўваюць за агітацыю сялянства супроць цара, паноў і высылаюць назад у Пецярбург, адкуль было яму забаронена ўжо выяжджаць на Бацькаўшчыну і гдзе аставаўся да сьмерці пад наглядам паліцыі. У Пецярбурзе піша чарод новых твораў — «Марія», «Осіі гл. XIV», «Молитвы» і інш., у якіх прапаведуе патрэбу паўстаньня й выражае гнеў на ворагаў народу. У 1860 г. выдае паўнейшы зборнік паэзіі „Кабзар".

10 сакавіка 1861 г. паэт памірае ад хваробы вадзянкі. Цяжкія пакуты жыцьця, жудасныя асабістыя перажываньні, цярпеньні й бязупынная барацьба за свой улюблены народ зламалі песьняра на 47 годзе жыцьця. З гэтых 47 гадоў жыцьця Шэўчэнка — 24 г. пражыў прыгонным, 10 год — у азіяцкіх крэпасьцях, 4 гады — пад пільным наглядам паліцыі й толькі 9 год (ад 1838 да 1847) — умоўна вольным.

Сьмерць песьняра ўскалыхнула й пакрыла жалобай усё чэснае й паступовае тагочаснае грамадзянства Расеі. Паэт-дэмакрат Курачкін на правізарычным пахаваньні Шэўчэнкі ў Пецярбурзе ў прамове сваей сказаў: „Яшчэ адна магіла раскрылася перад намі. Яшчэ адна чыстая, чэсная, сьветлая асоба пакінула нас; яшчэ адзін чалавек, які належаў да высокай сям'і абраных, які выказваў за народ самыя сьветлыя вераваньні, які адгадаў запаветныя яго думы й перадаў усё гэта няўміручым словам, скончыў горкае сваё жыцьцё, поўнае барацьбы й пакут".

Згодна з воляй Шэўчэнкі, цела ягонае было перавезена на Украіну, і пахавана пад Каневам, на берагу Дняпра, на высокай Чарнечай гары, 10.V.1861 г. Ягоная магіла ад таго часу сталася месцам масавых пілігрымак, якія аддаюць чэсьць вялікаму чалавеку й геніяльнаму паэту.

* * *

Шэўчэнка быў геніяльным паэтам, але быў ён здольным і арыгінальным мастаком, — а таксама сьпеваком — надта любіў і прыгожа сьпяваў украінскія народныя песьні.

Спадчына па ім, як мастаку, даволі вялікая — пакінуў больш 1000 абразоў, рысункаў і зарысовак.

Падчас прабываньня ў Акадэміі, Шэўчэнка захапляўся творамі акадэмічнага клясыцызму, пазьней адходзе ад яго й накіроўваецца да псыхолёгізму й рэалізму. У жывапісі, так як у паэзіі, дае чарод рэалістычных абразоў, якія сваім зьместам выражаюць дакор палітычнаму рэжыму, ілюструюць сацыяльную й нацыянальную долю ўкраінскага народу.

Шэўчэнка працуе ў многіх жанрах мастацтва — дае пэйзажы, партрэты, акваформы, разам з гэтым дае палітычныя

карыкатуры. Па ссылцы, апошнія два гады працуе над акваfортай. Захапляецца й вывучае акваформы Рэмбрандта — геніяльнага галандзкага мастака.

Гравюры з абразоў Рэмбрандта прыносяць Шэўчэнку славу й яму ў 1860 даюць годнасьць акадэміка „за мастацтва й веду ў галіне гравюрнага мастацтва".

Цікавыя пагляды Шэўчэнкі на мастака. Мастак — паводле яго — гэта «носьбіт сьвета праўды»; быць добрым гравюрыстам — гэта знача «спрыяць пашырэньню найхарашэйшага й павучальнага — сярод грамадзянства, — знача быць карысным людзям і Богаві".

* * *

Але заслыў Шэўчэнка не як мастак, і не як сьпявак. Заслыў ён і ўпісаўся залатымі літарамі ў гісторыі ўкраінскай літаратуры й культуры, а таксама ў гісторыі культуры агульна-чалавечай, як мастак слова, як геніяльны паэт.

Шэўчэнка перадусім паэт-лірык. Ліра ягоная, настроеная на патрыётычны лад, апявала слаўную мінуўшчыну Украіны, выражала пратэст супроць несправядлівасьці, зьдзеку й паняверкі ў адносінах да ўкраінскага народу з боку ягоных ворагаў палітычных і сацыяльных, прарочыла роднаму народу славу й добрую будучыню, адначасна выражала шчыры, апёрты на глыбокіх хрысьціянскіх асновах гуманітарызм, пачуцьцё пашаны да чалавека агулам.

Творчасьць Шэўчэнкі, у сэнсе фармальным і ідэйным, наскрозь пранітавана народнымі элемэнтамі.

„Глыбокая народнасьць — сутнасьць творчасьці Шэўчэнкі" — казаў Максім Горкі. А ведамы Добралюбаў пісаў: „У Шэўчэнкі ўвесь круг яго дум і спачуваньняў знаходзіцца ў літаральнай адпаведнасьці са зьместам і ладам народнага жыцьця. Ён вышаў з народу, жыў з народам, і ня толькі думкай, але й абставінамі жыцьця быў з ім моцна зьвязаны... Ён блізкі да народнай песьні, а вядома, што ў песьні выліўся ўвесь прайшоўшы лёс, увесь сапраўдны характар Украіны; песьня й думка складаюць там народную сьвятыню, лепшы здабытак украінскага жыцьця: у іх гарыць любоў да радзімы, зьзяе слава мінуўшых подвігаў; у іх дыхае й чыстае, пяшчотнае пачуцьцё жаночай любові, асабліва любові матчынай" (зусім такі характар мае й беларуская народная песьня, беларуская народная творчасьць).

Наш удумлівы крытык і паэт-эстэт, прадчасна памёршы Максім Багдановіч з нагоды стагодзьдзя ад дня нарадзін Шэўчэнкі, якраз 25 гадоў таму назад, прысьвяціў два артыкулы ўкраінскаму генію. Артыкулы напісаны ў рускай мове. У першым з іх п. з. „Краса і сіла", аўтар, праводзячы аналёгію між паэзіяй Шэўчэнкі й украінскай народнай паэзіяй, піша: «Ёсьць зоры, якія так блізкі адна да другой і так роўна

злучаюць сваё сьвятло, што здаюцца нам адным непарыўным цэлым. „Падвойнымі зорамі” называюцца гэтыя сьвяцілы. Іх лёс стаў лёсам музы Шэўчэнкі й украінскай народнай паэзіі: падвойнай зоркай сьвецяць яны ў сьвеце мастацтва й хараства». І далей, даўшы аналіз верша Шэўчэнкі й адзначыўшы спэцыфічныя асаблівасьці ягонай рытмікі, кажа, што „у асобе Шэўчэнкі сусьветная літаратура мае паэта з вершам мэлёдыйным і зграбным, паэта, які хараство сваіх твораў будаваў не на сродках паэтычнага ўплыву, што б'юць у вочы, а, наадварот, — на сродках найбольш тонкіх: асанансах, алітэрацыях, унутраных рыфмах; паэт, які да гэтага хараства адзначаных элемэнтаў вершаў далучыў яшчэ нязвычайную сілу сваіх рыфмаў, а таксама арыгінальнасьць, жывасьць і грацыёзнасьць рознастайных мэтраў”. „Якраз тут, — кажа Багдановіч, — у гэтай галіне верша й высьвятляецца, быць можа, найбольш дасканала ўсё тонкае хараство паэзіі Шэўчэнкі: звонку простая, скромная, яна поўна ўнутраным, прыхаваным, ня кожнаму зроку даступным прыгоствам”. Паводле ліку ўнутраных рыфмаў, у рускай літаратуры Багдановіч не знаходзе паэта, роўнага Шэўчэнку.—У другім артыкуле, Максім Багдановіч, разважаючы аб агульналюдзкім значэньні твораў Шэўчэнкі, піша: „Пэўне-ж, тыя глыбоканацыянальныя формы, у якіх заключаны агульналюдзкі зьмест, шмат болей скажуць сэрцу Украінца, чым чалавеку іншай народнасьці. Але й гэтаму апошняму Шэўчэнка ня будзе чужым і незразумелым, і ў яго душы творы ўкраінскага паэта знойдуць сабе водгук, бо пад іх сваеасабліваю чаканкаю хаваецца поўнацэнны мэтал духоўнай культуры, агульнай усім цывілізаваным народам”.

Асаблівае значэньне, зразумела, творчасьць Шэўчэнкі мае для ўкраінскага народу. Мы адзначылі вышэй аб гэтым. Тут яшчэ дадамо. — Творчасьць Шэўчэнкі фармавала й фармуе нацыянальную душу ўкраінскага народу, узгадоўвала й ўзгадоўвае яе ў духу безгранічнай любові да сваей Бацькаўшчыны, у духу патрэбы працы й барацьбы за лепшую будучыню Украіны.

Творчасьць Шэўчэнкі сталася магутным фундамэнтам для ўсяго ўкраінскага нацыянальна-культурнага будаўніцтва й для ўсяго ўкраінскага адраджэнскага руху; у цяжкіх хвілінах народнага жыцьця — яна зьяўляецца й надоўга будзе зьяўляцца жаралом веры, натхненьня дзеля творчай патрыятычнай дзейнасьці Украінцаў. „Імя Шэўчэнкі — пісала «Діло» 12 сакавіка 1939 г. — ёсьць сынонімам веры, надзеі і любові”; Шэўчэнкі „усё жыцьцё й ўся духовая спадчына — гэта адзін вялікі гімн бадзёрасьці й ідэалізму”.

* * *

Сьвет адгукнуўся на творчасьць геніяльнага ўкраінскага паэта, так дзеля фармальных, як і ідэйных ейных вартасьцяў.

Украінскі Навуковы Інстытут у Варшаве ў 1938 г. выдаў том XV твораў Т. Шэўчэнкі — *„Шевченко в чужих мовах"*. У ім пададзена багатая чужая бібліёграфічная літаратура аб жыцьці й творчасьці Шэўчэнкі, а таксама пераклады твораў Шэўчэнкі на чужыя мовы.

Аб папулярнасьці ў сьвеце Шэўчэнкі сьведчаць пададзеныя ў томе пераклады некаторых твораў паэта на розныя мовы, у ліку больш 19, належачыя да групаў моў: германскай, раманскай, славяна-балтыцкай, тюрка-татарскай і жыдоўскай. Пададзеныя так-жа там і пераклады на беларускую мову. Сярод перакладчыкаў беларускіх вылічаны паэты: Ф. Чэрнышэвіч, Я. Купала, А. Гурло й М. Краўцоў. І толькі. Мы ведаем, што над перакладамі Шэўчэнкі працаваў большы лік беларускіх паэтаў. А такі Максім Багдановіч, якога цікавыя выказваньні аб творчасьці Шэўчэнкі падалі мы вышэй і які пералажыў, праўда, на рускую мову, некалькі вершаў Шэўчэнкі („Кастамараву", „У няволі", „У няволі цяжка" і інш.), ня ўспомнены ў кнізе аніводным словам ані ў аддзеле беларускім, ані ў аддзеле рускім!

Родны, блізкі нам геніяльны Украінец. І песьня яго, як кажа Купала, „нашла водгалас пачэсьне ў сэрцы беларускім".

Вялікі ўплыў зрабіў Шэўчэнка на беларускую літаратуру. Тэматыка, ідэі, мастацкія сродкі творства — вось той матарыял, які бралі з творчасьці Шэўчэнкі некаторыя нашыя паэты.

Пад уплывам музы Шэўчэнкі спасярод старэйшых беларускіх паэтаў знаходзіліся — Янка Купала, Якуб Колас, Зьмітрок Бядуля, з паваенных, маладзейшых паэтаў, — Паўлюк Трус, Пятрусь Броўка, Аркадзь Куляшоў і інш.

Сёлета, з нагоды юбілею Шэўчэнкі, слаўнаму ўкраінскаму юбіляру прысьвяцілі цёплыя, шчырыя вершы: белар. сав. паэты: Я. Купала, Я. Колас, Пятрусь Броўка і паэтка Эдзі Агняцьвет. Асаблівым-жа адзначэньнем сёлетняга юбілею было, як адзначана на пачатку, выданьне Бел. Дзярж. Выдавецтвам поўнага збору паэзіі Шэўчэнкі — „Кабзар" у перакладзе на беларускую мову.

Жыве Т. Шэўчэнка сярод свайго Народу, жыве сярод нас Беларусаў, жыве й у шырокім сьвеце.

Яго ідэі і мастацкае слова няўмірушчыя!

Літаратура: Т. Г. Шевченка, повній збірник творів, під редакціею Д. Дорошенка. Катеринослав, 1914; Тарас Шевченка, т. XV. — Шевченка в чужих мовах. Выданьне Украінскага Навуковага Інстытуту. Варшава-Львоў, 1938; Большая Советская Энциклопедия, т. 61, Масква 1934; «Звязда» №№ 51, 53, 55, Менск, 1939; «Полымя рэвалюцыі» №№ 1, 2, 3. Менск, 1939; «Літаратура й Мастацтва» №№ 11, 12 (артыкул Якуба Коласа «Шэўчэнка й беларуская паэзія»), 13 і інш. Менск, 1939.

Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

Запавет

Як памру, дык пахавайце
Мяне на кургане,
Сярод стэпу шырокага
На Украіне слаўнай,
Каб бязкрайнія разлогі,
І Дняпро, і кручы
Было відна, было чутна,
Як грыміць грымучы.

Як ён змые з Украіны
У сіняе мора
Кроў ворагаў... Вось тады я —
І поле і горы
Усё пакіну, паляту я
Да Бога самога
Памаліцца... Да таго-ж я
Ня ведаю Бога!

Пахавайце, ды ўставайце,
Ланцугі парвіце,
І варожай злой крывёю
Волю акрапіце.
І мяне ў сям'і вялікай,
Сям'і вольнай, новай,
Памянуць вы не забудзьце
Ня злым, ціхім словам.

25-сьнежня 1845 у Пераяславе.
Пераклаў *З. Бядуля*

Т. ШЭЎЧЭНКА

(З „Гімаліі“)

Сном дрэме ў гарэме — ў раю Візантыя
І дрэме Скутары; і толькі шуміць
Басфор неўгамонны, то стогне то вые,
Відаць Візантыю задумаў збудзіць.
А сінее мора гавора Басфору:
«Глядзі, а то я твой ўсхвалёваны шум

І пену хваль ілам закідаю горай!
Ня ведаеш хіба, якіх я нясу
Гасьцей да султана?»

Так мора спыняла.
(Любіла адважных, чубатых славян).
Басфор схамянуўся, Турэччына спала,
Драмаў у гарэме пракляты султан.
Адно ў падзямельлі ў Скутары ня могуць
Казакі заснуць. І чаго яны ждуць?
Пасвоему моляцца скутыя Богу,
А хвалі на той бок ідуць і равуць.

Пераклаў *М. Танк*

Мне усёроўна, ці я буду
Жыць ў Украіне век, ці не,
Ці хто успомне ці забудзе
Мяне завеянага ў сьнег
Ў чужым краю — ўсёроўна мне.

Ў няволі вырас між чужымі,
І неаплаканы сваімі,
Ў няволі плачучы памру.
Малога сьледу не пакіну
На нашай слаўнай Украіне,
На зямлі нашай — не сваей.
І не успомне бацька з сынам,
Ня скажа: «Галаву схілі,
Маліся, сын: за Украіну
Яго замучылі калісь».

Мне усёроўна, ці сьвятыя
Славы пачуюцца, ці не...
Але не усёроўна мне,
Як Украіну людзі злыя
Прысьпяць, як акрадуць яе
І збудзяць ў ночы агнявыя...
Гэта не усёроўна мне!

Пераклаў *М. Танк*

М. ТАНК

Да справы перакладаў мастацкае літаратуры

Усё больш і больш нам прыходзіцца спатыкацца на літаратурнай ніве з суседзямі, перадусім з тымі суседзямі, якіх жыцьцё так падобнае да нашага жыцьця — і цяжкімі абставінамі, імкненьнямі і барацьбой. Праяўляецца зацікаўленьне як з аднэй, так і з другой стараны. Працэс гэты павінен і па меры магчымасьці будзе паглыбляцца далей, ня гледзячы, якімі граніцамі й часам мы аддзелены, на якой мове складаюцца песьні. Важна, што яны зьвіняць тымі самымі струнамі, што й нашы.

Пераходзім да справы перакладаў.

У нас яшчэ можна спаткаць нейкае незразуменьне гэтага пытаньня. Адны баяцца «чужых уплываў», другія — ня лічаць патрэбным пераклады з літаратураў расейскай, польскай, украінскай..., бо й так кожны інтэлігент-Беларус зразумее творы напісаныя ў гэтых мовах. Перадусім «уплывы» самі сабой адпадаюць праз дабор перакладаных твораў, а хіба ніякай пагрозы ня можа быць для нас з боку мастацтва, калі ў гэтай галіне будзем магчы нечага навучыцца.

Праўда, недаацэнка перакладаў мае свае, хоць усё-ж неабаснаваныя прычыны. Калі Пушкіна, Міцкевіча, Шэўчэнку разумее інтэлігенцыя, дык гэта яшчэ ня ўсё. Трэба іх зрабіць даступнымі масам, якія яшчэ іх не разумеюць. Зноў-жа й да самога перакладу трэба падыходзіць больш паважна, не забываючыся, што гэта ня простае рамясло, але адна з тых галін літаратурнай працы, якая вымагае здольнасьці вычуцьця, веды, апанаваньня мовы арыгіналу й творчага падыходу.

І хоць у нас ужо даўна распачалася праца над перакладамі (Колас, Купала, а цяпер маладняк), усё-ж у самым працэсе гэтай працы над вартасьцямі таго ці іншага перакладу ў нас зусім мала цікавіліся й застанаўляліся пры ацэне. У выніку чаго, перакладаючы напр. Пушкіна ці Шэўчэнку ў нас проста перапісывалася, дзе-ня-дзе толькі зьмяняючы, як зазначыў др. Я. Станкевіч (Т. Шэўчэнка, том XV, Варшава 1938 бач. 197), фонэтыку й памагчымасьці морфолёгію, слоўнік.

Блізкасьць нашай мовы да ўкраінскай і рускай дае нам магчымасьць зблізіць пераклад да арыгіналу, захоўваючы ня толькі стыль, але й рытміку й рыфмы, што напр. немагчыма пры перакладах некаторых твораў на польскую мову з беларускай дзеля адсутнасьці (дактылічнага) націску на трэйцім

складзе й агранічанай колькасьці мускіх рыфмаў. Немагчыма напр. пералажыць:

„І пачнеш блудзіць ты песьнямі
зноў над нівамі узорнымі"...
(„Нарач")

або паэму «Журавінавы цьвет» тэй рытмікай, якой яна напісана. Але з другога боку блізкасьць да мовы арыгіналу ствараe пагрозу, што перакладчык можа лёгка стаць перапішчыкам, які зусім мала што мае супольнага з мастацтвам. Перакладаючы Пушкіна «Анчар» мясцамі можна слова ў слова перапісаць пабеларуску: —

К нему и птица не летит
и зверь нейдёт, лишь вихор черный
на древо сьмерти налетит...

перакладаем:

Да яго птушка не ляціць
ня йдзе зьвер, толькі вецер чорны
на дрэва сьмерці наляціць...

І паміма таго, што застаўся й вобраз той самы й рыфмы (налетит—наляціць) чуецца ўся беднасьць такога перакладу. Трэба перш учуцца, памагчымасьці адтварыць вобраз. Лепш нават «забыцца» на йснуючыя рыфмы, хіба ніяк іх ня можна абмінуць, а на зьмест глядзець, як на матарыял, які ты мусіш апрануць у мастацкую вопратку:

На ім і птушка не спачне,
зьвер сьледу блізка не пакіне,
часамі вецер ахіне —
сьмяротны веіць над пустыняй.

Або:

Яд каплет сквозь его кору,
к полудню растопясь от зною
и застывает к вечеру
густой прозрачною смолою.

Перакладаем:

Як толькі сонца стане грэць
атрута капае, расіцца,
пад вечар стыне на карэ
густой празрыстаю жывіцай.

Гэтыя кароткія заўвагі перадусім трэба помніць пры перакладах твораў Т. Шэўчэнкі, якія для нас маюць вартасьць ня толькі з боку мастацкага; Шэўчэнка ёсьць, як кажа St. Tudor, „ogromnie współczesny". Лепшыя рэчы варта перакладаць некалькі асобам,—была-б большая магчымасьць параўняць, выправіць і павучыцца.

ЯЗЭП ПУШЧА

Новыя лісты

(Із зборніку „Песьні на руінах", бач. 111—120)

Не пракляну сваіх радзінаў
Пад сіпласьць ядраў халастых;
Ізноў з чужыны на радзіму
Мне хочацца паслаць лісты.

Ня вымерлі усе жывыя, —
Есьць там радня мне па крыві.
Чаго ваўкі так з ветрам выюць?
Чыя пагібель на краі?

Якія ў хмарах завываньні!
Як-бы нябожчыкаў нясуць.
Сьпяваюць сіверы літаньні
Пра радасьць нашу і пра сум.

Ці-ж варта сьцюжай атуляцца?
Пад ёй сінее цела й кроў,
Ржавее дзень сыры на клямцы,
Вылазіць волас з чорных броў.

Ў людзкіх вачох асеньні сполах,
Мігрэні змучанай пары.
Я чую, як пад жоўты шолах
Ганяюць чорныя шары.

Шапоча чэрап чалавечы...
Більярдны стол... жалобны кон...
У сягонешні сьвяточны вечар
Прайду я ціха ля вакон.

Ня буду заглядаць у шыбы —
Баюся радасных грымас.
Я вылечу свае ушыбы,
А покуль—ўсім спакойны час.

I

Мой родны, як здароўе, сілы?
Якія радасьці ў сям'і?
Ці старасьць ног не падкасіла,
Ці з рук ня выпусьціў сяўні?

Хто ў ночы блудзіць ля ваколіц,
Хто моліцца перад Хрыстом?
Мяне ўсё гэта непакоіць, —
Такі асеньні ўжо настрой.

Татуля мой, паклон ад сына,
Паклон суседзям і радні.
Хацеў-бы быць я селянінам
У нашы ўзьюджаныя дні.

Ды што-ж, калі жыцьцё судзіла
Інакшы лёс ад роду мне:
Я закідаю рук вудзілны
На шыю песеннай вясьне.

Тулюся целам няпрытомным
Да палкіх форм яе грудзей.
Яна трымае песень томы
І церні радасных надзей.

Таму й пакінуў я палетак,
З курамі сонную павець.
Ня ведаю — ці ўцямна гэта,
Ці ў моцы сына зразумець?

Татуля мой, ты няпісьменны,
Жывеш 'шчэ першабытным днём
Заўсёды вечарам асеньнім
Ідзеш у хлеў з сьвятым агнём.

Ўсё там авеяна таемным, —
Загадкай вечнай чорны цень.
Ідзеш бачком — хадою кемнай
І моўчкі тулішся да сьцен.

Я вобраз гэты сёньня бачу
І сам падобен да яго.
Мае удачы і няўдачы
Разьвейце, ветры, па лагох!

На йгрышчы гэтым я ня буду,
А ты, татуля, ўсё-ж схадзі!
Пайду я заўтра чорным грудам
У даль маўклівую адзін.

Сяброў сваіх я там ня стрэну,
Іх сьцежкі ўлукаткі пайшлі.
З свайго дастану сэрца стрэмку
І уваткну ў душу зямлі.

Няхай адчуе боль цярпеньняў,
Якія ў песьнях я нясу.
Зара мне зваліцца на цемя,
Рассыпле йскрыстую расу.

Падстаўлю ёй гадоў прыгоршчы
І чэрап памінальных дзён.
Над смуткам, гольле рас-
[пасьцёршы,
Заплача прыдарожны клён.

Лісты дарогаю гусінай
У вырай будуць адлятаць.
Татуля мой, прыдзі да сына,
Не дачакаўшыся й ліста.

Ты да магілы знойдзеш сьцежку,
Чытаць я вершы буду там;
Сваю апошнюю усьмешку
Табе з паклонам перадам.

II

Халат вякоў віхры ўзматнулі,
У гадох застукаў дзень крыві;
Мая цярплівая матуля,
Паклон сыноўскі мой прымі.

Якія-ж дні цябе сустрэлі
Каля расхрыстаных лагчын?
Пісалі мне, што пастарэла,
Што твар на пісягох маршчын?

Чало пакрыў бялявы смутак,
Вачэй блакіт паласкавеў.
Тваёй тугі вячэрні згустак
У чары лье асеньні зглей.

Зара над хатай пазяхае;
Ідзеш адна ты цераз двор...
Вярба схілілася сухая
Каля засмучаных вазёр.

Такія вобразы і зданьні
Перад вачмі маіх трывог.
Твае сялянскія паданьні
З душы сваёй я не зьбярог.

Калісьці, праўда, быў аратым,
А сёньня іншае пасяг:
З сваім малодшым братам
Нясу скрываўлены твой сьцяг.

Няхай сабе растрэпле сівер,
Няхай парве і кіне ў дол.
Мая матуля, ʼшчэ ня вымер
У душы сыноўскай сум і боль.

Хацеў-бы я, каб паміж днямі
Прабег пудлівай масьці лось...
Ня ведаю, ці ўспамінаеш
Мяне ты за вячэрай сьлёз?

Калі вялікі ўсходзіць месяц,
Гляджу заўсёды ў даль дарог:
Якія рыцары гразь месяць
І хто зьяжджаецца на торг.

Шуміць бярозавы гасьцінец,
Гальлё сланяючы ў бакі.
Мая матуля, срэбны іней
Губляе месяц ля ракі.

Лавіць яго ў зялёных марах
Дазволена глаўлітам мне.
Я вельмі рад—жыву ня марна,—
Вянок паложаць на труне.

Пісаць ня маю больш нічога,
Пяро скрабе далоні рук.
Мая пясьнярская дарога
Не давядзе мяне к дабру.

Усе, усе й мае навіны,
Ня маю ўцешыць болей чым.
Вітаньне шчырае ад сына...
Душы ніяк не залячыць.

III

Ня змогуць завесьціся ў словах мікробы,
Патручаны ўсе сулімою і воцтам.
Поэты Заходняй, Усходняй Эўропы,
Вам ліст пасылаю сэкрэтнаю поштай.

Вялікую страту дзяржавам учыніць:
Ня возьмуць з яго, ні цэнзурных, ні мытных.
Поэты, хто дзьверы з вас першым адчыніць?
Хто хоча пачуць беларускія рытмы?

Даўно вы поэзіі ўжо ня чыталі;
Абрыдла як вам і жыцьцё, і плянэта!
А ў нашай краіне пад гукі цымбалаў
Уцешныя песьні сьпяваюць поэты.

У пушчы шумлівай, дуброве зялёнай
Мы ловім і любім таемнае штосьці;
Там нашы эстрады, там нашы салёны,
К нам вецер увосень заходзіць у госьці.

Яго мы частуем рабінавым сокам, —
Каб ведалі толькі, якая ў нас восень!
Ліст кожны ўзьвіваецца ў неба высока
І віхры між зорамі белымі носяць.

У нашых прасторах шмат казачных шумаў...
Ці быў хто калі з вас у нашым Палесьсі?
Ці бачыў, як сінія хвалі сумуюць,
А людзі сьпяваюць спрадвечныя песьні?

У гэтым сягоньня і наша уцеха,
Ад гэтых вось песень мы й вучымся ладу.
Поэты у нас не разьбіты на цэхі,
Ніхто не складае дакучных балядаў.

Ў нас новыя творацца песьні і жанры, —
Ня любім мы толькі кляймо на іх ставіць.
Паслухайце раніцай, вечарам раньнім,
Як ветры старонкі кніг нашых лістаюць.

Мы блізкія сёньня людзям і прыродзе, —
Ў нас пульсы крывёю зьвярынаю б'юцца.
Ці чулі што-небудзь аб нашым народзе?
Ці чулі што-небудзь аб вечным бяспуцьці?

Ліст гэты пішу я да вас з Беларусі,
Дзе зоры вачэй аніколі ня плюшчаць...
Вітаньне з паклонам зрываецца з вуснаў,—
Бывайце, бывайце!.. Вітае вас.

П у ш ч а.

СТАНІСЛАЎ ГРЫНКЕВІЧ

Трагічны крызыс

Аднэй з характэрных, найбольш мо' важных свомасьцяў і праяваў жыцьця зьяўляецца *рух*. У пайме руху ляжыць імкненьне (у самым прадмеце ці дзеючай волі) да нечага новага. Рух — гэта перамена месца, пошукі новых аспэктаў, новых формаў жыцьця.

Ад пачатку арганізаванага жыцьця ў людзей наглядаецца гэнае самае зьявішча. Новыя ідэі, вандроўкі людзей паасобных і народаў, сацыяльныя, рэлігійныя, эканамічныя плыні, а ў сувязі з гэтым войны, рэвалюцыі, змаганьні аружныя і неаружныя — гэта ня што іншае, як праявы таго самага біолёгічнага закону, датарнаванага да канкрэтнае эпохі. Гэныя рознаякія «рухі»—сьведамыя й нясьведамыя, прадбачаныя й непрадбачаныя, ці накінутыя незалежнымі вонкавымі ўмовамі,—зьдзейсьняюць паасобныя *культуры й цывілізацыі*. Вядомы нам сьвет у сваю гістарычную пару пережыў шмат заняпадаў і нарадзінаў новых культураў і цывілізацыяў.

Ці заняпады адных эпохаў і паяўленьне новых прыходзілі крытычна, значыцца раптоўна, неспадзеўкі, трудна сказаць. Трэба думаць, што крызыс, аднолькава з гэтым, як наглядаем у біолёгіі, мае свае прадпасылкі. Прадпасылкі, вялікае іх мноства, расьцярушываюць нашую ўвагу й дзякуючы таму сам крызыс часта здаецца нам зусім незразумелым, вырасшым неспадзеўкі, хаця ён толькі лёгічным канчаткам ранейшых фактаў

Мы сяньня прывыклі да самога тэрміну «крызыс». Ён не прадстаўляе для нас быццам нічога таёмнага. Усе прывыклі да крызысу эканамічнага, які толькі што пережылі, ці яшчэ пережываем. Крызыс сяньня—гэта нешта пэрманэнтнае. Наймаладзейшае, пасьляваеннае пакаленьне ня ведае агулам іншых умоваў жыцьця, чымся з пары «крызысу». Думаючы аб крызысе, маем на ўвеце адну толькі ягоную старану, мяноўна эканамічную. У сапраўднасьці гэта адна толькі з праяваў трагічных нашых дзён, ломкі старога, пошукаў новага, нейкае вялікае мітусьні ідэяў, лёзунгаў з павадырамі ўсякіх масьцяў. За гэнымі фрагмэнтамі, за жывымі дзеючымі асобамі, за падзеямі блізкімі нам асабіста, ня відаць сапраўднага жарала мітусьні, ня бачым, як чэзьне дасюлешняя форма праяваў душы, ня бачым, як паміраe, прыйшоўшы ў тупік, сучасная нам культура й цывілізацыя.

Чаму думаючы аб сучаснай пары датарнаваў-бы да яе назоў «трагічны крызыс»? Дзеля таго, што на'т пры сьмерці вока радуецца новым жыцьцём, якое прышло на зьмену старога. У ймгле, расьцярушанасьці сяньняшняе эпохі ня выра-

стае нічога новага, што магло-б, хаця-б ад часьці, быць лепшым за паміраючае старое.

Ці сапраўды ніхто ня бачыць і не ўяўляе трагедыі нашых дзён? Ёсьць людзі дальназоркія, цьвярозыя, правільна ацэніваючыя становішча. Іхні голас мала толькі чутны сярод зьвягі падгалоскаў тых, каму патрэбныя чад і гоман ніжэйшых інстынктаў і почаваў чалавека.

З паміж дыягностаў, пішучых у розных мовах, у розных часьцях сьвету, хацеў-бы спыніцца над паглядамі *A. Carrela.* Кніжка, у якой гаворыць на нашую тэму аўтар, мае назоў *„L'homme, cet inconnu"* (*„Чалавек істота няведамая"*). Вельмі цікаўна, што аб чалавеку, як аб нечым няведамым, піша біолёг, адзін з найбольш выдатных і заслужаных дасьледчыкаў у сваёў адумысловасьці. Прозьвішча аўтара шырока праслаўленае ў міжнародным сьвеце, як найбольш сьмелага экспэрымэнтатара над тайніцамі жыцьця. У сваёй кніжцы на некалькісот бачынах даў ён чытачу амаль ня поўную сынтэзу ўсяго, што навука ў сваіх рознаякіх галінах даведалася аб чалавеку, як аб суцэльнасьці біолёгічна-псыхічнай. І гэны вучоны называе аканчальна свой твор *„Чалавек—істота няведамая"*...

Некалькі стагодзьдзяў працяжнае працы ў лябораторыях, кніжніцах, нагляданьня за праявамі натуры паказала нам тайніцы й свомасьці матэрыі, дало ўладаньне над «небам і зямлёю», толькі ўсё гэта не дало адказу, не адчыніла нас самых перад сабою. Гэта тэза й адначасна выснаў Carrela. Кажа ён, што ўвесь поступ цывілізацыі ня вырашыў найважнейшых, найбольш аснаўных праблемаў, *чым* можам прыдбаць чалавеку больш шчасьця, ад якіх дзейнікаў шчасьце залежыць. І здаецца, што не падыходзілі мы бліжэй да вырашэньня гэнага пытаньня, хаця ўсё было быццам накіравана да гэтага. Заміна ляжала ў памылковым сьветапаглядзе, у самай атмасфэры адносінаў да жыцьця. Матэрыялізм — вось калецтва чалавека. «Вера», што матэрыя крыніца й чалавека й ягонага шчасьця, накіровывала на фальшывы шлях пошукаў у напрамку ня тым, як трэба. Боль, цярпеньні паказывалі, што неяк яно нясkладна йдзе, клікалі да рэвізіі паглядаў.

Здабычы тэхнікі выклікалі колёсальныя перамены ў жыцьці штодзенным. Жывецца сяньня лепш і лягчэй, чымся калісь. І хаця аўтар мае на ўвеце Амэрыку з ейнаю цывілізацыяю, можам з ім згадзіцца без засьцярогаў. Бязумоўна, сучасны пролетары й селянін жывуць і ядуць быццам лепш, чымся вяльможа некалькі стагодзьдзяў таму назад.

Здабычы іншых эпохаў, ведамасьці тэхнічныя й агульныя, дзякуючы прэсе, дзякуючы агульнай шырокай асьвеце, узбагачываюць розум. Затое трудна казаць, каб старана маральная паказывала аднолькавы поступ і была на вялікім узроўні. Вера ў матэрыю зрабіла непатрэбную веру ў значэньні рэлігійным.

Як гэта пераломліваецца ў чалавеку? Усе меркаваньні й дзеяньні накіроўваюцца ў напрамку, які здаецца нам практычным і карысным. Тып адзінкі, якая вырастае ў такой атмасфэры, вызначаецца хітрасьцю, адсутнасьцю таго, што завём «хрыбятніцаю маральнаю». Нястача фундамэнту маральнага, калі няма нічога сьвятога, пэўнага, адклікаецца ў плошчы інтэлекту. Асьвета робіцца патрэбнай, паколькі яна мяркуе аб практычнай старане, няма імкненьня безінтэрэсоўнага паглыбіць яе.

З памылковых адносінаў да праўды жыцьця пачало яно выглядаць, як прыгожы твар адлюстраваны ў крывым люстры. Заняпад маральнасьці, нястача вялікіх ідэалаў, дэгэнэрацыя духовая й далей цялесная — вось дарожка, якая адчыняецца перад намі. А ўсё праз тое, што натуга навукі й тэхнікі мела на ўвеце не найшырэйшае дабро чалавека, а толькі выкарыстаньне ўсіх магчымасьцяў адзінкі й грамады дзеля разьвіцьця й поступу гэнае-ж тэхнікі. Ніхто ня цікавіўся чалавекам-адзінкаю, ня ведалі, ці забыліся аб сапраўдным зьмесьце чалавека. Забыліся, што самапазнаньне можа быць лекам на гэнае зраўнаньне ўсіх перад бажком — цывілізацыяю матарыяльнаю.

Чалавек — гэта крыху больш, як пэўная колькасьць фізыка-хімічных свомасьцяў. Дзеля здароўя, значыцца дзеля добрага самапачуваньня, ня толькі важна, каб усе органы цела працавалі без пахібаў. Пачуцьцё, якасьць інтэлекту, узровень маралі, агульнае разьвіцьцё духовае — ўсё гэта дзейнікі й складовыя часткі здароўя й якасьці адзінкі й ня менш важныя за старану чыста цялесную. Бяз гэных свомасьцяў вышэйшае катэгорыі безкарысным, ці на'т шкодным будзе поступ тэхнічны. Не навукі мэханічныя, фізычныя й хімічныя дадуць нам мараль, здароўе, розум, роўнавагу псыхічную й нэрвовую, пачуцьцё бясьпечнасьці. Ня толькі фізыка й фізыёлёгія хай будуць асновамі ўзгадаваньня, трэба пакінуць належнае месца дзеля характару, праблемаў эстэтыкі, рэлігіі.

Ашчаднасьць, імкненьне да найбольшае карысьці й выкарыстаньня давялі да спэцыялізацыі, звужваючы й абмяжоўваючы агульныя магчымасьці паасобнае адзінкі. Жыцьцё-ж само ня ведае такое вызначанасьці й яно прымушае адзінку непадгатаваную вырашаць у чужой ёй дзялянцы.

Дык ніколі ня можна астацца бяз *сынтэзы* й бяз людзей, якія выпрацоўваюць сынтэзы, прынамся найважнейшыя з іх.

Дасюлешнія нашыя ведамасьці аб старане цялеснай чалавека вырасьлі вельмі высака. Трэба аднак сказаць, што такія, вельмі простыя, хаця й аснаўныя адначасна пытаньні, як скажам: як зьдзейсьняецца паняцьце? якія шляхі лучаць мозаг з думкаю? — яны дасюль нам няведамыя й ня вырашаныя. Ахвотна раўняюць арганізм чалавека з машынаю. Калі ёсьць тутака аналёгіі, дык ня трэба забывацца, што й розьні-

цы вельмі вялікія. Чалавек можа нясумерна больш стрываць, чымся выходзіла-б з магчымасьцяў ягонага цела, дзе нам здаецца мы ўсё разумеем.

Незалежна ад адаронасьці прыроднае, можна павялічыць інтэлект пры дапамозе працы — прывычкі да мышленьня, спасьцярогаў, нутраное дысцыпліны. Затое пераход хуткі да новых уражаньняў, шматлікія перамены рознаякіх абразоў і перажываньняў, недахоп ці нястача паглыбленьня, няўмеласьць да напружаньня — ўсё гэта спыняе разьвіцьцё інтэлекту. Можна было-б дадаць, што зашмат спортаў, лішне багатая ежа пакідаюць ад'емныя сьляды на духовым росьце. Аднаго толькі інтэлекту мала на тое, каб стварыць веду. Навуковая праца, досьледы—залежаць ня толькі ад розуму. У вялікай часьці гэта выплад інтуіцыі, выабражэньня — іншых старон і праяваў духа. Нашаю толькі аднабокасьцю можам паясьніць крытычныя адносіны да мэтапсыхікі, тэлепатыі, шостага органу пачуцьця (*К. Рышэт*). Трэба прыйсьці да вываду, што ёсьць у нас і пачуцьцё маралі. Яно слаба разьвітае, гэта праўда, праца над ім пакінута прадстаўніком веравызнаўчых установаў (калі агулам пакінута). Гэнае пачуцьцё можна ўзгадаваць.

Незалежна ад паглядаў, трэба згадзіцца, што адзіным правілам паступаньня, у лепшым разуменьні гэтага слова, у адносінах паміж людзьмі, асталася мараль хрысьціянская. Праўда, на жаль, яна штораз больш цьвёрда адкідаецца, як нейкая непатрэбшчына. Адначасна бачым, што мараль біолёгічная й прамысловая, як крытэрыі паступаньня, даводзяць да сытуацыяў вельмі добра ведамых усім, між іншым і нам Беларусам. Бяз правілаў нутраных няма роўнавагі ў жыцьці асабістым, грамадзкім, дзяржаўным. Маралі не накіне нам дзяржава. Найбольш накіне яна нам межы, за каторымі чакае нас кара. Апошняя форма ўзгадаваньня ня будзе сапраўдным узгадаваньнем.

У хрысьціянстве наглядаем цікавае зьявішча, сяньня амаль што нам незразумелае. Сьвятыя ў хрысьціянстве не найразумнейшыя, а найбольш стойкія характарам і моцнаю воляю. І сапраўды, пачуцьцё маралі важнейшае ад розуму. Харство маральнае можа нас хутчэй закрануць і скрануць, чымся харство прыроды й навукі. Адначасна-ж яно павялічвае сілу інтэлекту. Яно зьяўляецца асноваю лепшае стараны нашае цывілізацыі й культуры ў большай меры, чымся навука й мастацтва.

Умовы сучаснага жыцьця забіваюць эстэтычныя патрэбы й вымогі. Арганізацыя працы нажаль накіроўваецца так, каб прыбіць эстэтычныя пачуцьці. І тутака прападае магчымасьць здабыцьця крышкі шчасьця, неабходнага, каб жыць нармальна, гармонійна. І вось гэнае гармоніі не хапае якга ў нашым сучасным жыцьці. Такі пагляд мае сваё абаснавань-

не ў фізыёлёгіі. Аднабокае раздражненьне даводзіць да закалоту ў дзейнасьці на'т чыста цялеснай. А пяршынства матэрыі і ўтылітарызму — гэтыя догматы промыслу — давялі да аднабокасьці ў разьвіцьці адзінкі, выкрывілі культуру інтэлекту. Імкненьне да карысьці, да багацьця робіцца ўсім і ўсё апраўдывае. Такія сытуацыі даводзяць да зьявішча, амаль што натуральнага для нас, што ў вязьніцы сядзяць людзі толькі дурныя. Іншыя, якім, скажам, трэба было-б сядзець, карыстаюцца пашанаю й славаю. Астаючыся пастаянна ў гэтых плынях, чалавек пачынае да іх прывыкаць і не ўяўляе іншае магчымае рэчаіснасьці.

Бязвыхаднаю ўжо трагедыяю будзе вывад, якога ніхто не аспорывае, што праца — гэта найвялікшае зло. Можна думаць, што ўвесь наш поступ накіроўваецца да таго, каб нічога, а прынамся найменш рабіць. Другая трагедыя, што чалавецтву не пакідаецца «надзеі» іншае, як тая, што менш будзе працы й больш грошаў. Надзея — магутны дзейнік пры вучобе датарнаваньня да новых умоваў. Багацьце ня будзе замінаю ў тых ці іншых імкненьнях адзінкі. Замінаю ў багацьці будзе варожасьць да асяродзішча й консэрватызм, якія йдуць поруч з багацьцем.

Увесь склад нашага жыцьця такі, што не падтрымлівае яно індывідуальнасьці адзінкі, а заганяе яе ў тую ці іншую форму. Да ад'емных старон сучаснае школы, абмінуць якія здаецца зусім немагчыма, — што лішне рана дзіця мусіць уваходзіць у форму. Няма што казаць аб тых пэрспэктывах, якія робяцца вельмі актуальнымі, калі дзеці ад першых дзён будуць узгадовывацца ў грамадзе без атмасфэры хатняе. Калі й будзе тутака натуральны падбор, дык ня ў добрым значэньні паняцьця.

Усё гэта, можна сказаць, адзін вялікі грэх проці натуры. Помста біолёгічная рэалізуецца залежна ад умоваў і магчымасьцяў. Тутака помста праяўляецца ў тым, што ток, разгон жыцьця аслабявае. Прападае ідэя...

* * *

Вось дробная жменя думак з кніжкі Carrela. Carrel—Амэрыканец, чалавек практычны, які лёгічна думае і ўсё даводзіць да канца, ня спыняючыся на палавіне дарогі. Паставіўшы дыягнозу на асноведзі вышэй паказаных фактаў, што чалавецтва апынулася ў тупіку, шукае ён леку. Яму здаецца, што ён яго найшоў. Ці так, — казаць цяжка.

Мы, «адсталыя» людзі, інакш крыху ацэніваем сытуацыю, гледзячы на свой панадворак. Нам не пагражае яшчэ сяньня бязідэйнасьць, вузкі матэрыялізм, мы ўмеем бачыць зоры на небе, а дробныя клопаты — хмаркі хаваюць іх ад нас, аднак ад пуцяводнае зоркі не астаёмся далёка. Дык і лек паводле рэцэпты Carrela прадчасны, хаця ня можна казаць, каб быў

ён несымпатычны. «Найвышэйшая рада мудрацоў», вельмі блізкая да ідэалу манахаў, нікому не пашкодзіць, а памагчы можа шмат каму. Carrel рабіў-бы сваю «раду» паводле агульнага й вострага стажу паасобных сяброў. Мы мо' вырашылі-б больш індывідуальна, кожны па сабе на свой лад.

Ня будзем спорыць з аўтарам. Важнейшы для нас дыягноз і аналіза сытуацыі, якія праведзены вобразна й пуката. Лішне чорныя колеры мясцамі выкліканы лёкальнымі амэрыканскімі ўмовамі. У цэласьці бяручы, кніжка — гэта крык адчаю чалавека, які глянуў цяжкой праўдзе ў вочы. Выхад з сытуацыі бачыць ня ў поступе цывілізацыі й тэхнікі, а ў старых праўдах, даўно ведамых і таму недацэніваных, як трэба.

Кожны чалавек можа сам толькі навучыцца хадзіць. Усякія хітра выдуманыя прылады, палягчаючыя навуку хадзьбы, —карысныя пастолькі, што памагаюць менш разоў падаць на зямлю. Знайсьці свой шлях можа кожны паасобку. Стадныя рэцэпты жыцьцё выкідае вельмі хутка, бо яны ня могуць адрабіць работы за адзінку. Усё-ж такі практыка й досьлед чалавека шчырага, сумленнага будзе заўсёды павучальны й што найменш гэтак можам глядзець на кніжку й думкі Carrela.

М. КРЫВІЧ

Жаданьне

Асушылі ветры росу,
недзе у ваччу...
Я ня вузкія палосы
апяваць хачу,

а бязьмежную ясноту,
тых няшчасных ніў,—
ў сэрцы зацьвіла ахвота
запаліць агні...

Не па сьцежках пнуцца ў гору,
не праз вузкі шлях! —
даляцець-бы да прастору
у бязьмежжы дня, —

на узорны шлях бязконцы,
шоўкавую сінь,
у разіскранага сонца
залатую плынь!

АНАТОЛЬ БЯРОЗКА

Credo in duos deos

Сёньня думы свае патушу ў непакорнай у белі.
Хай запеніцца хмельна, пацячэ цераз край,
пырсьне бурнаю бельлю вясна маладая —
яблын цьветам на зялёны на май...

Чуй. Сырыя грудзі зямлі, напоены потам мужычым,
доўга кроў — гарачую чырвань цадзілі у росьцьвіту бель;
хаты, ўрослыя ў чорную гразь, закарэлыя ў болі
векавою тугою набраклі і сабраці суляць жніво—
там, дзе косьці нямыя бацькоў парахнеюць пад мохам.

Перад богам маіх бацькоў голаў схіляю долу.

А калі над вясною замучанай зашапоча яблыні цьвет,
на галіны, на май ацярушыцца бельлю,
калі ветрам у твар запахне — тады ятрацца раны,
тады будзяцца песьні пра сілу і гнеў — а рукі гатовы
заўтрашні дзень адчыніць сабе стальлю...

Я малюся за гэтакі дзень богу маіх патомкаў.

11.V.1939.

М. КРЫВІЧ

Сумуючай

Слатлівым дажджом ня ўмывай
парванае ў сэрцы каханьне...
— Глухі галалёд і зіма
ізноў на прадвесьні растане.

Пад ночы купальнае цень,
жар сэрца—стаптаны няласкай—
пабачыш... Яшчэ зацьвіце
чырвонай гарачаю краскай!

Калосьсе хвалюючых ніў
раззвоніцца сьмехам жаночым.
— Дык раны у сэрцы пакінь
лячыць дажджом сівым і слоцьцю!

---

* * *

Пад звон дратоў сумуючы,
мой брат, ідзеш куды?
Дзе кінуў вёску, вуліцу,
дзіцячыя гады?..

Знаць, птушкай пералётнаю
ляцеў ты ў край вясны,
ды шэрай непагодаю
апалі туманы

ў прасторах; а з варожбамі
хтось шлях твой заараў,
каб з торбамі парожнымі
цябе твой край спаткаў.

Ці горш? — Ў душы з трывогаю,
за лепшы пералёт,
на сьцежках лёг з зьнямогаю
пад цяжасьцю няўзгод.

Ды не! — надзею тоючы —
той промень веснавы —
у сэрцы раны гоячы
ня схіліш галавы!..

А пад той звон сумуючы
ты з кудраў сум страхнеш,
і вёсцы, роднай вуліцы
сьпяеш ты аб вясьне!

* * *

Вясна! І тысячы сугуччаў
лавінай грудзі залілі.
Юнацтва дні і бэз цьвітучы
дзявочча вочаў!.. Эх, калі
мяне мінулі вы, як казка?!
Прайшлі гады. Але й цяпер
сваёй запозьненаю ласкай
яшчэ стучыце ў сэрца дзьвер.
І — шчасьце! — жэзлам чарадзейным
кранёна сэрца ў трыццаць год!—
і зноў на крыльлях лятуценьняў
юнацкіх дзён лаўлю акорд.
Хоць знаю я ўсю боль утраты,
як пройдзе той пахмельля чад,
але за жар вясны дваццатай
гатоў жыцьця пакінуць шмат!

Я. СТАНКЕВІЧ

Мова крывіцкага (беларускага) рукапісу XVI стаг. „Аль кітаб“

Фонэтычны й морфолёгічны разбор

(Працяг, гл. № 1 (18) „Калосься“ з 1939 г.).

Зьмены самагуку е.

Да другое катэгорыі адхінаў належаць тыя прыклады, у каторых *е* асталося не перайшоўшы ў *о* ў старой групе зь мяккім *р* сонантычным, значыцца перад *р* ацьвярдзелым. У крывіцкім языццэ *е* перад ацьвярдзелымі сугукамі не пераходзіць у *о*, дык можна было-б падумаць, што дзеля таго не перайшло і ў вышменаваных прыпадках. Аднак тут гэта ня мае значэньня, бо крывіцкае *р* ацьвярдзелае ўжо з пары праславянскае, дзе ацьвярдзела дыялектычна (гл. ніжэй пры *р*). Прычына тут накшая, пайменна тая, што да ведамае пары група сугук+*р* сонантычнае зь пярэднепаднябенным самагуковым элемэнтам+сугук*) аставалася ў крывіцкім языццэ із спачатнай сваёй вымоваю. Калі пасьлей *р* сонантычнае было заменена часткава пераз *-ір-* (*міргаць*), часткава пераз *-ер-* (*мерзнуць*), процэс пераходу *е* ў *о* быў скончаны, дзеля таго ў гэтай групе *е* ня было абнята разгляданай зьяваю. Адзіночныя прыпадкі з *о* на месцу *е* ў гэтай групе лёгка могуць быць выясьнены аналёгіяй. Гэтак *чорны* подле *добры* і пад.

Націск у мове «Аль кітабу» зусім такі самы, як цяпер у віленска-ашмянскіх гутарках. Дзеля таго *е* ў dat. pl. ludzem (мноства прыкладаў) можна выясьніць адно хіба тым, што ў старую пару *е* перад *м* не пераходзіла ў *о*. Падобна слова «неба» сустрэлася толькі з *е*. Няма ведама чаму ё *е* ў iz'veŭ 74b15, 74b13. У nametka 49b4 можна бачыць націск на *на-*.

На месцу націсьненага *е* канцавога часткава маем *е*, часткава *о*.

е ё: 1. у 2 pl. ind. praes: dajece 9b9, 9b10, ne 'addaśce 15a15, ležice 118b7, 119a8, umrece 119a4 і інш. — заўсёды, адхінаў нямашака.

2. У gen. sg. займёнаў асабовых і зваротнага: mene, cebe, śebe.

3. У прыслоўю *яшчэ:* Ješče 18b17, 19b10, 43b1 і інш.

---

*) У друкарні няма адумысловых значкоў, дзеля таго мушу апісаваць тое, што можна было-б перадаць пры помачы прынятай у навуццы транскрыпцы.

Заўсёды ё *о*: 1. у прыслоўю *ўжо*: užo 19b14, ‘užo 19b15, 54a6.

2. У nom.-ac. sg. jo — асноваў subst. neut.: pecju (= pecjo) 5a1, jejcu (=jejco) 30a13, pleĉo 71b2 і інш.—подле аналёгіі *акно, дабро*.

Pronomina neutra маюць *о* ў nom.-ac. sg. адно часткава: ŭśo tvajo 120a3, svajo 4a14, słova majo 96a10, uśo 45b15 і інш. *о* тут паўстала аналёгіяй *то*.

Хормы з *е* ў гэтых склонах у мяншыні: serce tvaje 58a17, vujśka (= voj-) tvaje 59a17, svaje (цела) 58b5, cełа tvaje chto rastupic (= — top-) 59b3, cełа maje rastopic ib. 5, miłośerdze svaje učinic 10a2, Džebra‘ił pašuŭ (= -šoŭ) na svaje mejsca 62b12, pakajenje svaje ‘uzrūšiŭ 65a3, ‘uśo cełа svaje 69b4, ‘aĉiści cełа maje 72a1, paddanstva svaje 79b9, za ūśe tuje (= тое) 78b3, svaje 80a6, śvetoje ime tvaje 83a8, małaku (= —ko) svaje 129a4 і інш.

Бачым, што аналёгічны самагук *о* запанаваў адно ў канчатку назоўных імёнаў (substantiva), а ў займёнаў *о* ўжывалася побач із спачатным *е*.

У цяперашняй мове віленска-ашмянскага прастору на месцу *е* нац. на канцы 2 pl. ё заўсёды *о* (*дасьцё, глядзіцё* і інш.) Значыцца гэтае *о* з *е* паўстала пазьней із прычыны вытваранага аканьням чаргаваньня ненац. *а* з нац. *о* (*сяло, памяло — сёлы, памёлы*). З тае-ж прычыны паўстала раней *о* ў *ужо*. У паўднёва-заходнім дыялекце крывіцкім (беларускім) і цяпер менаваныя хормы маюць на канцы *е* (*ясьце, ужэ*). Там-жа ё *е* ў nom.-ac. sg. займёнаў ніякіх (*мае*), але ў віленска-ашмянскіх гутарках толькі *о* (*маё* і інш.). Значыцца, што кірунак аналёгічны (подле *то*), каторы ладне захапіў гэты канчатак у пару напісаньня рукапісу, з часам чыста перамог.

Сьведчаньням мовы «Аль кітабу» і цяперашняе крывіцкае мовы паўдзённа-заходняе (Наваградчына, Горадзеншчына, Случчына і інш.) зьбіта цьверджаньне Сабалеўскага («Лекціи»[4], 63) і Карскага (Бѣлоруссы, II—1, 197), што ў крывіцкім языцэ канцавое *е* па зьмякчэлых сугуках пераходзіць у *о*. *е* тут можна выясьніць адно тым, што яно спачатнае, тымчасам *о* выясьняецца лёгка аналёгіяй асноваў цьвярдых (*адно, дабро, то* і пад.). Дзеяньне гэтае аналёгіі захапіла такжа канцавое *-а* (*-‘а*) з ę спачатнага nt — асноваў; гэтак цяперака маем: *дзіцянё, ягнё* і інш. зам. ранейшых *дзіцяня, ягня* і інш.

У языццэ польскім, украінскім і нарэччу паўночна-расейскім *е* пераходзіць у *о*, як у складох націсьненых, так і ненацісьненых. Але ў языццэ крывіцкім разам із абруселым нарэччам даўнейшых крывіцкіх Вяцічаў (т. зв. цяпер паўдзённа-расейскім нарэччам) бачым пераход *е* ў *о* адно пад націскам, бо ў складох ненацісьненых *е* пераходзіць у *а* (*‘а*). Подле аналёгіі зь іншымі языкамі славянскімі, мы спадзяваліся-б, што таксама ў крывіцкім перад паўстаньням аканьня *е* ненац. пе-

раходзіла ў *о*. Але выглядае, што аканьне ў сваім пачатку ранейшае за лябіялізацу *е*, пайменна, калі апошні процэс пачаўся ненацісьненае *е* было відавочна рэдукаваўшыся, дык не магло лябіялізавацца, а, значыцца, і пераходзіць у *'о*, але з часам пераходзіла ў *а*.

ѣ ці *е* з *ѣ* у *о* не пераходзіць: z'vezdi 107b4, zvezdi 116a2, zvezdam 123a1, źvezdi 123a4.

Выпаданьне *е* маем: 1. У gen. sg. m. n. займёнаў *мой, твой, свой, чый:* majho 4a15, 84b15, majho 111a8, 125a8, svajho 13b2, 20a11, 47a7, 51b14, 52b7, 64b5, 66a11, 76a10, 85b11, 88b9, tvajho 19b3, čijho 37b17, 38a2, 38a3, 38a4. Гэтыя хормы ўжываюцца звычайна проці адзіночных з *е:* majeho 96b1, svajeho 66a6 і г. д. Яшчэ радзей сустракаюцца ў «Аль кітабе» хормы сьцягненыя — maho і г. д.

2. У dat. sg. тых-жа займёнаў: svajmū 44a7, svajmu 44a8, tvajmū 93a16, 106b7, 106b12, 114a7, majmū 106b5, 106b11, 107a2, 122a3. Адхінаў ад гэтага няма.

3. У a) vajvudaj (= vajvodaj) 19b13, vajvuda (= vajvoda) 19b14, але vujevuda (= vojevoda) 19b11, vojevoda 127b5. Цікава, што ў двух апошніх прыкладах з *е* маем у першым складзе -*о*- (значыцца ненац. *о* не перайшло ў *а*); дык два апошнія прыклады можна ўважаць за полёнізмы.

b) Адно з выпалым *е* ўжываецца пазычанае слова «майстат»: majstat 18a6, 18a5, 114b8, 123a9, 123b5, 135a7, 135a12, majstatach 56a4, majstataŭ 96b1.

4. У злучы ніжлі (зь ніжэлі): nižli 37a16, 75b10, 84a1, адно́лькава ў niž 84a2.

Адпалае е знаходзім спарадычна ў ненацісьненай частцы *že:* idziž 51b17, Tož 54a6, timiž pałcami 73b13, Tahož 106b4, 107a3, tajež 110a7, tajež hadziny 125a9, Janož 70a5.

Зьмены самагуку ѣ.

Дыфтонгі на месцу ѣ. Можна ўважаць, што долех прыведзеныя прыклады адбіваюць вымову *ѣ* як дыфтонґу: vjedomij 5a14, 75b9 (ведамы), nevadaje 25a13, 33a6, 40b15, 57b3, 80a7 (ня ведае), narazaŭši 26a8 (нарэзаўшы), zavašana 116a3 (завешана), dana vadac 138b7, čełevake 135b17, śveata 115b1.

На першы пагляд можна было-б у j у слове «vjedomij» бачыць імкненьне да абазначэньня зьмякчонага *в*. Але характэрна, што *j* ёсьць у складзе націсьненым, у каторым у паўднёва-заходнім дыялекце беларускім цяпер ·ё дыфтонґі, а былі ў XVI стаг. і ў дыялекце цэнтральным*), а, значыцца і ў ві-

*) Паказаў я гэта ў сваёй рэцэнзі ў „Balticoslavica" II. працы Штангавае (Stang Chr. S.) „Die westrussische Kanzleisprache..." Як паказуе Карскі, у крывіцкім дыялекце цэнтральным і цяпер ёсьць двугукі ў некаторых мясцох.

ленска-ашмянскім, што ґеоґрафічна і подле сваіх асаблівасьцеў займае месца паміж іх. Ня маючы апрычонага значка дзеля абазначэньня дыфтонґу, аўтару не аставалася нічога лепшага, як абазначыць яго пры помачы *j*+*e*. Меней пэўнасьці ў вабазначэньню дыфтонгу пры помачы значка дзеля арабскага *a* даўгога. Але нельга также паверыць, каб магла быць 9 разоў апіска і заўсёды на месцу націсьненага *ѣ*. Думаю, што, ня маючы апрычонага значка дзеля дыфтонгу, аўтар абазначыў яго значком дзеля арабскага даўгога *a*, каторы ў яго ў даным прыпадку меў значэньне ня *a*, але самагуку даўгога, значыцца бліжшага да двугуку, чымся кароткі. У прыкладзе śveata двугук абазначаны двума значкамі.

На бач. 43 быў прыведзены прыклад на двугук на месцу спачатнага *o*.

ѣ у дзеясловаў „сядзець, помнець“. Накш як у языццэ расейскім і згодна з асталымі языкамі славянскімі ў крывіцкім захавалася *e* з *ѣ* ў дзеясловах «сядзець, помнець». Гэта так сама адбіваецца ў «Аль кітабе»: preromnaйši 65a2, тут ненацісьненае *ѣ* перайшло ў *a*; śedzić 1b1, 14b3, 14b4, 18b15, śedzec 14a2, 33b13, śedzeй 14a16, 22b5, śedzeči 73a7, ne śedzi ib. і інш. Адхінаў нямашака.

Адпалае ѣ маем у прыслоўным прыймені *акром* з *окромѣ* (скасьцянелы loc. sg.): 'akrom 42b8, 'Akrom 40b14, 48b10, 53b14, 57b3 і інш.

Замена ъ, ь.

У залежнасьці ад палажэньня *ъ*, *ь* або вакалізаваліся ў *o*, *e*, або чэзьлі. Подле *сон—сна, дзень—дня* у расейскай мове ў ведамай групе словаў пачало ў косых склонах выпадаць *o*, *e* спачатнае: *ров—рва, лёд—льда, корня, камня, шти* (значыць *шасьці*) і пад. (глянь Сабалеўскі, Лекціі[4], 56). У беларускім языццэ аналёгія дзеіла ў кірунку адваротным: *o*, *e* не мянялася, а пад уплывам прыпадкаў з *o* спачатным паўставала *o* на месцу спачатнага *ъ* там, дзе апошні, будучы ў слабым палажэньню, мусіў шчэзнуць. Дзеіў тут також nom.-ac. тых словаў, дзе было *o* з моцнага *ъ*. Прыр. Карскі, II—1, 175, 179, 230 й 232.

Таксама ў нашым рукапісе *e*, *o* спачатнае ня чэзьне: kamenem 73a1, 73a11, kerani 124a3 і пад. *o* ў рукапісе на месцу *ъ* слабога ў склонах косых: ratuй (= ratoй) 1b8, iz rota 53b7, 'u roce 123a2, 'u kaźnam roce 132b7.

Нормальнае шчэзьненьне *ь* у косых склонах маем у слове «чэсьць»: pej s'elevat' o tści praroke 133a3. Аднолькава ў прыметаў: 'us'civaje i charošaje reč rozum 136a3, 136a13. І ў назоўнага імені, утваронага, ад гэтае прыметы: 'utścivaśc 62a2,

'utścivuści 62a1. Таксама ў іншых старых памятках крывіцкіх (у хорме *тсти, сти, чти*) і ў бальшыні цяперашніх нарэччаў (прыр. Карскі, II—1, 231). Аб *тс, с* замест *ч* у *тсти tści* гл. ніжэй пры сугуках.

Вакалізаца новых паўсамагукаў

Просьле аслабленьня, а далей і шчэзьненьня канцавых ераў часта паўставалі цяжкія дзеля вымовы групы сугукаў. У таковых прыпадках усе славянскія языкі палягчалі сабе вымову тым, што ў новапаўсталых групах паміж сугукаў зьяўляліся новыя еры (Сабалеўскі, Лекціи[4], 53). Вакалізаца іх згаджалася з вакалізацай ераў старых. Але магчыма, што ў таковых прыпадках *о, е* паўставалі пад уплывам аналёгіі тых прыпадкаў, дзе яны разьвіліся фонэтычна з даўнейшых *ъ, ь*. Прыклады з рукапісу: 'ahon 53b7, 53h8 і h. d,, vuhalja 10b13 (зборнае ад *вугаль*). Канцавое *а* ў vuhalja паказуе, што націск, як і ў цяперашняй мове, на *-га-*. Значыцца, маем націсьненае *а* на месцу спадзяванага *о*.

Подле А. Пацебні («Къ исторіи звуковъ русскаго языка I, 90—103) ды Сабалеўскага («Лекціи»[4] 25—28) у ўсходне-і часткава заходне-славянскіх языкох із праславянскае групы, што складалася із складатворнага *р, л* із самагуковым элемэнтам стаячага паміж двума сугукамі, паўставалі групы tъгъt, tъlъt, tьгьt, tьlьt, а напару tьгъt, tьlъt, як рэзультат узьніку сварабактычнага самагуку між ліквідаю а наступным сугукам. Гэта завецца другім паўнагалосьсям. Калі запраўды было другое паўнагалосьсе, дык быў-бы на яго ў рукапісе адзіны прыклад у małanja 2b8, małanje 25b16; літ. *е* ў канчатку паказуе, што націск быў на складзе *-ła-*, як у цяперашняй мове. Тут, значыцца, таксама было-б *а* замест спадзяванага *о*—так-жа з прычыны пазьнейшага пераносу націску з канчатку. В. Ягіч у «Критическія замѣтки по ист. рус. языка». Пецярбург 1889, 23 дапушчае 2-ое паўнагалосьсе адно для цяперашняга паўночнарасейскага нарэчча. У цяперашнім крывіцкім языццэ прыкладаў на 2-ое паўнагалосьсе вельмі мала (прыводзіць іх Карскі ў II—1, 309) і могуць яны зусім добра быць выясьнены аналёгічным уплывам словаў із *о, е* спачатнымі, або паўсталымі з моцных *ъ, ь*. Прыклады на гэтую зьяву із старых памяткаў ня пэўныя, іхнія *ъ, ь* маглі паўстаць із прычыны ймкненьня пішучых да графічнага аддаленьня групы колькіх сугукаў. Гэткія прыклады, прыводжаныя Сабалеўскім, як старыя *отверьзу, церьковь,* цяперашнія рас. *верьх,* пол. wierzch паказуюць толькі на мякчыню *р*. Ягіч там-жа добра паказуе, што ў старых памятках прыкладаў з двума *о* або *е* блізу нямашака (адзіночныя прыклады ня розьняцца ад такіх, як *агонь* з *огнь* і пад.), а дзеля таго *ъ, ь* у *оръ, ерь* нельга прыймаць за аба-

значэньне самагуку. Для крывіцкага і іншых языкоў славянскіх трэба згадзіцца зь Ягічам, што 2-га паўнагалосься ня было, але можна сумлявацца, ці такжа ў паўночна-расейскім нарэччу ў групе з *-оро-*, *-оло-* і пад. на месцу tъrt, tъlt, tьrt, tьlt маем 2-ое паўнагалосьсе, а не аналёгічнае паўстаньне подле словаў із *о, е* спачатнымі або паўсталымі з моцных ераў. Дыкжэ дзеля таго ў крывіцкім языццэ маем такія прыклады, як *вугальля, маланьня,* што ў вакаючай мове на паўстаньне новых самагукаў паміж сугукамі ўплывалі ня толькі *о, е,* але такжа *а.*

Заменьнікі ъ, ь у групе гъ, lъ, гь, lь.

Заменьнікамі ъ, ь у групе гъ, lъ, гь, lь ё такжа *о, е,* калі еры ў палажэньню моцным: kruŭ (= kroŭ) 43b6, 34b11 і іншыя. А калі еры ў гэтых групах у палажэньню слабым, дык заменьнікамі іх ё *ы, і:* jak małanje bliśnec 25b16, krivi 27a1, krivavimi 52a8, hłiboka 73b1 (дапушчаю прсл. дыял. *glъb-*), hłybokaśсі 133a5, trima pałcami 73b11, prehłinuła 79a5, strivaju 94b4, triścini 104a13, drižaŭ 105a15, 127b2, drižic 106a2, drižała 125a7, drižali 127b3.

Карскі, II—1, 98 выясьняе гэтую зьяву так, што слабыя паўсамагукі ў такіх групах чэзьлі, але *р, л,* апынуўшыся між сугукаў, перайшлі ў сонанты (як гэта бачым у языццэ чэскім і сэрбскім), а потым разьвілі просьле сябе самагукі *ы, і.*

У гэтых групах маем нярэдка ацьвярдзелае *л,* прыкл.: расхлыстáць, расхлысьлівы Ластоўскі, Рас.-кр. слоўнік, 606, закінуць вяроўку захлыскай ibid, 718, прыр. рас. расхлестать; клыгтаць, клыгатáць, Арол клыгоча — крыві хоча ibid., 260, прыр. рас. клегтать. Із спачатнага mьgla ё *мыгла* (мой запіс у Краўскай вол. Ашм. пав.), мыглець ibid. Ацьвярдзеньне l, m у гэтых і падобных прыкладах магло стацца адно тады, калі l не стаяла перад самагукам. Дык *і, ы* ў групах *-рь-, -ръ-, -ль-, лъ-,* а такжа *-мь-, -мъ-* і *-вь-* (зьвінець) не паўсталі вакалізацай *ъ, ь.*

Выясьненьне Карскага можа быць падзьдзержана яшчэ тым, што таксама ў чэскім языццэ із сонантычных *р, л* ё дыялектычна trit, tlit: pryšі, plyt' (J. Gebauer, Hist. ml. I., бач. 291) ды tirt, tilt: syrp, syrna і пад. (ibid.), бо вельмі лёгка, што із сонантаў із самагуковым элемэнтам паўстаюць *ры, рі, лы, лі,* або *ір, ыр.*

Як бачым із прыкладу *мыгла,* сонантычным рабілася такжа *м* у палажэньню перад шчэзлым слабым ерам.

Лічба 8 у «Аль кітабе» лучыла толькі ў хорме *асьмі* nom.-ac. sg. Прыклады: ebdes'u kolka preškod nehožich jest? — 'Ośmi jest 43a13, побач: Kolke što kolvek pristojnaśсі jest? — *Рас* jest 43a8, ośmi rajoŭ tabe 'abecūju 4a1. Таксама ў словах склада-

ных: ‘aśminaccac t’is’ečej 4aб, ‘aśmidześat t’is’ečej 67a1, Ebū Chenīfeh jeho miłośc ‘u ‘aśmidześat hod... radziūs’e 69a9, Metūšelechovi ‘u sto ‘aśmidześat śem hod ‘uradziūśe Lamech 98b16, ośmisot hod 103b14 і інш.

У цяперашніх віленска-ашмянскіх гутарках хорма nom.-ac. sg. *aśmi* ўжываецца каля м. Жупраны Ашмянскага пав., аб чым мне паведаміў ст. Ант. Шукелайць.

Калі-б *-і* паўстала не па *м*, стаячым па сугуку, а па якім іншым сугуку, можна было-б думаць, што яно лучыла з косых склонаў. Але дзеля таго што *і* ё адно ў лічбе osmь (а ня *сем* ці інш.), дык прычына яго паўстаньня будзе гэткая: *м* па шчэзьненьню *ь* у *осм* у злучэньню перад сугукам словах складаных ды перад сугукам наступнога слова перайшло ў *м* складатворнае з наступным самагуковым элемэнтам, з часам пераходзячы ў *-мі*, а далей гэтае *-мі* ў лічбе 8 ўвагульнілася, значыцца стала вымаўляцца такжа перад самагукам наступнога слова.

Таксама трэба выясьніць хорму 1. sg. *есмі*, агульнаведамую з ранейшых крывіцкіх памяткаў кірыліцаю, а пайменна, па шчэзьненьню *ь* ў jesmь, перад сугукам наступнога слова *м*, апынуўшыся паміж сугукамі, вокалізавалася і з часам перайшло ў *-мі*, каторае далей увагульнілася. Што запраўды гэтак было, бачым із таго, што *дамь* ані *емь*, у каторых *м* не стаяла па сугуку, не перайшлі ў *дамі*, *емі*.

Трэ тут зацеміць, што няма довадаў на дагадку Сабалеўскага, што *р*, *л* сонантычнае было так-жа ў паўночна-расейскім нарэччу. Назоў м. Пскоў із Plьskovъ і наагул пскоўскія памяткі ня маюць тут значэньня, бо Пскоўшчыну насялялі не Расейцы, але часьць племені Крывічоў. Адзін прыклад крстихомъся, прыведзены Сабалеўскім у «Лекціях»[4], 54 з ноўгарадзкага Апостала 1391 г. можа быць апіскаю.

Заменьнікі р, л сонантычных.

Заменьнікамі прсл. групаў сугук + сонантычнае р, л із папярэднім самагуковым элемэнтам + сугук ё *-ор-*, *-оў-*, *-ер-*: ‘ahornuc 29b11; horła 126a8, kormec 130a2, śmercej 106b9 і пад.

Але ё такжа прыклады, дзе, як у цяперашняй мове, маем у менаванай групе *-ір-*: čirvunam (= — vonam) 17a16, čirdunahu (абмыла зам. čirvonaho) 42a5, čirvonahu 109a3.

У рукапісе ў вышменаваных групаў хормы з -ił-, -il ня стрэліся, але лучылі прыклады па -il на месцу спачатнага -el-: stvaricila 29a8, stvaricil 77b7. Падобныя прыклады ё такжа ў цяперашніх дыялектах крывіцкіх. Тутка -il мусіла паўстаць пад уплывам словаў з -il- на месцу праславянскага *л* сонантычна-

га зь пярэднепаднябенным самагуковым элемэнтам. Адноўчы лучыла stvaricl 80b10.

Карскі, II—1, 159 добра думае, што *-ір-, -ыр-, -іl-* паўсталі з прсл. *р. л* сонантычнага із самагуковым элемэнтам. Подле Карскага прыклады на *р, л* сонантычнае сустракаюцца ў старых крывіцкіх памятках да XVII стаг. (прыкл. *тргъ* Зборнік XV стаг. і інш.), але ўжо ад пал. XV стаг. аднолькава частыя *-ыр-, -ір-, -іл-* на месцу *р, л* сонантычных, дзеля таго прыклады пазьнейшыя трэба ў бальшыні ўважаць за напісаньні традыцыйныя.

Прыклады з *-ыр-, -ір-* на месцу *р* сонантычнага ў рукапісе абмежуюцца вышпрыведзенымі, але наагул у крывіцкім языццэ іх мноства.

Карскі (Бѣлоруссы, I, 99) выясьняў, што *-ыр-, -ір-, -іl-* у вышменаваных групах паўсталі такім спосабам, што ненацісьныя *ъ, ь* чэзьлі, *р, л* рабіліся сонантычнымі, а потым разьвівалі перад сабою *ы, і,* аднačасна трацячы свой вокалічны элемэнт. Аднак таму, каб *-ы-, -і-* паўставалі адно ў складох ненацісьненых (або хіба наагул у палажэньню слабым), пярэчаць прыклады, прыводжаныя Карскім (*смрть* і пад.) і шмат прыкладаў ведамых мне з народнае мовы. Дык уважаю, што *р, л* сонантычныя аднолькава паўставалі як у складох ненацісьненых, так і націсьненых, як ля ераў слабых, так і моцных. Паўстае пытаньне, калі ў гэтых групах зьяўляліся сонантычныя *р, л,* гэта значыцца, ці дастаў іх беларускі язык із пары праславянскае, як чэскі і языкі паўдзённа-славянскія, або прсл. групы з *р, л* сонантычнымі ў беларускім языццэ, так сама як у расейскім і ўкраінскім, перайшлі ў -tъrt-, -tъlt- і г. д., г. зн. *ъ, ь* сталіся гукамі складатворнымі, а *р, л* сугукамі. Калі-б *ъ, ь* ў гэтых групах у старую пару крывіцкага языка вокалізаваліся, а *р, л* сонантычныя страцілі свой сонантычны элемэнт, сумлеўна, каб у пазьнейшую пару гэтыя *ъ, ь* ізноў чэзьлі, а *р, л* рабіліся сонантамі. А калі-б гэта сталася, дык узноў трудна дапусьціць, каб яшчэ пазьней шчэз сонантычны элемэнт у *р, л.* Гэта вельмі борздыя зьмены ў кірунку праціlежным, што выглядае непраўдападобна. Наадварот, зусім магчыма, што крывіцкі язык дастаў сонанты із самагуковым элемэнтам із пары праславянскае; гэныя сонанты пазьней на грунце крывіцкім разьвівалі перад сабою *-ы-, -і-,* адначасна трацілі свой вокалічны элемэнт, рабіліся сугукамі. *-ы-, -і-* із сонантычных *р, л* разьвіліся фонэтычна. Магло разьвіцца фонэтычна *-оў- з* l сонантычнага із самаг. элемэнтам у словах, як *воўк, маўчаці, поўны* і пад., чаго аналёгію маем у языццэ славенскім, дзе сонантычнае *р* ё дагэтуль. Гэтымбы адначасна выясьнілася, чаму на *-уl-, -іl-* мала прыкладаў. Што сонантычныя *р, л* з прсл. сонантаў із самагуковым элемэнтам былі ў усіх словаў гэтых групаў, сьведчыла-б такжа тое, што перад *р, л* пісалі ў памятках *ъ, ь* яшчэ тады, калі

ў іншых мясцох замест *ъ, ь* ужо пісалі *о, е*, прыкладам у смаленскім лісьце каля 1240 г.*)

ор, ер на месцу *р* сонантычнага ў таковых словах, як *торг, корч, борзды, сьмерць,* якія, як у «Аль кітабе», так і ў цяперашняй мове звычайныя, маглі паўстаць пад уплывам аналёгічным словаў, дзе *о, е* спачатныя або з прсл. *ъ, ь* складатворных, прыкл. *роў, нос, сон, мерці* і пад. Гэткаму аналёгічнаму дзеяньню найбалей паддаваліся словы аднаскладовыя назоўных і прыметных іменаў, што блізу заўсёды лучаюць із *о, е*. Што гэткае дзеяньне аналёгіі вельмі лягкое, пакузуе нам прыклад чэскага языка, дзе цяпер ё сьцяг словаў з *е* на месцу спачатнага *р* сонантычнага ў гэтай групе (čert, žert, červ, černy, čerstvy).

Адумысловае дасьледаваньне гэтае зьявы павінна канчальна яе выясьніць у крывіцкім языццэ.

ВЛАДАС ДРЭМА

Беларускае народнае мастацтва

Найважнейшай пазыцыяй у беларускім мастацтве агулам ёсьць бязспрэчна й прадусім народнае мастацтва. У беларускім народным мастацтве знаходзім найбольш старасьвецкіх элемэнтаў, дайшоўшых да нас шляхам традыцыі; іх беларускі народ прысвоіў, культывуючы тысячагодзьдзямі. У гэтым мастацтве мог народ найсвабадней і найшчырэй выявіць свае ўпадабаньні, артыстычнае пачуцьцё.

Характэрна, што беларускае народнае мастацтва ёсьць дзіўна блізкім не да народнага мастацтва суседніх славянскіх народаў, але — да народнага мастацтва літоўскага народу. Народнае мастацтва Беларусаў і Літоўцаў вырасла на аднэй аснове мастацтва пэрыяду нэоліту й затрымала характар дэкарацыйны, з матывамі арнамэнту чыста тэхнічнага, г. зн. абумоўленага свомасьцямі матарыялу й прыладзьдзя да абрабляньня. Яго арнамэнтыка з лінейнымі й пласка-геомэтрычнымі матывамі выражае непасрэдныя й рачовыя адносіны да матарыялу, тэхнікі й мастацтва. Мастацтва гэтых народаў ухіляецца ад лішняе пустое гутаркі, літаратурнасьці й усякіх

---

*) А. Шахматаў: „Нѣкоторые оригинальные русскіе памятники сохраняютъ буквы ъ ь въ сочетаніяхъ ър, ьр, ъл, замѣняя вообще сильныя ъ, ь буквамі о, е; ср. напр. смоленскую грамату около 1240 года, гдѣ пишется: търгование, търговати, дългъ, дълженъ, дължбита, но рядомъ возьма, вощець, смоленск, смолняниномь, княземъ (у вапошніх двух прыкладах адно з прычыны тэхнічнае пастаўлена тут я замест малога юса — як у Шахматава Я. Ст.) „Курсъ", 69.

выдуманых прадметных ілюзіяў і прырода-расьлінных матываў. Фантазія гэтых народаў ёсьць так багатая, што патрапіць, не стараючыя зусім пазычаць у прыродзе, знайсьці непалічаную колькасьць матываў з камбінацыі найпрасьцейшых геомэтрычных формаў. Суседнія славянскія народы, як польскі, рускі, украінскі, маюць мастацтва з перавагай арнамэнту іменна расьліннага, абразковага.

Зьявішча сваяцтва беларускага й літоўскага народнага мастацтва тлумачыцца хіба супольнай праз даўжэйшы час дзяржаўнасьцю, утратай беларускім і літоўскім народам уласнай шляхты, а так-жа супольным гістарычным лёсам гэтых народаў, як народаў сялянскіх, жывучых у паншчыннай няволі, перажываючых супольную нядолю й зьдзекі з боку сацыяльных ворагаў. Малазямельнага беларускага й літоўскага селяніна змусілі жыцьцёвыя абставіны да якнайбольшай самавыстарчальнасьці, эканамічныя ўмовы накіравалі ўсю ягоную тэхніку працы ў эпоху гладжанага каменя, калі таксама быў змушаны да поўнай самавыстарчальнасьці гаспадарскай і культурнай. Ад гэнага часу — з прад тысячы гадоў — да сяньняшняга дня амаль ня выходзіў ён з рамак гэнай самавыстарчальнасьці. Яшчэ сяньня можна сьцьвердзіць на Палесьсі й на іншых тэрыторыях, заселеных Беларусамі, гэтую нэолітычную самавыстарчальнасьць беларускага селяніна.

Гэтым тлумачыцца аднальковасьць і сваяцтва арнамэнтыкі беларускага й літоўскага народнага мастацтва з мастацтвам нэоліту, і дзеля гэтага яно захавала свой чыста прымітыўны геомэтрычна-ідэографічны характар аж да сяньняшняга дня. Аднак-жа, пад уплывам этнічных розьніцаў, у мастацтве пачалі выступаць некаторыя розьніцы,—так, як у спосабе мышленьня, адчуваньняў, у тэмпэрамэнце, у псыхічнай будове Беларусаў і Літоўцаў.

Характэрным мамэнтам у народным мастацтве зьяўляецца блізкая сувязь яго з акружэньнем, з прыродай, якая (сувязь) тлумачыцца тым, што зямля ёсьць стыхіяй, карміцелькай і жаралом дабрабыту й роскашаў селяніна. Злучыўся ён з зямлёй целам і душой. І дзеля гэтага вытвары мастацтва й народнага рамясла зьяўляюцца быццам далейшым працягам і дапаўненьнем прыроды.

Усякі, ужываны ў народным мастацтве матарыял народ бярэ з зямлі й найбліжэйшай прыроды. Будзе гэта гліна, камень, льнянае валакно, воўна ад авечак уласнай гадоўлі, дрэва, салома, вікліна, мука ўласнага меліва і т. д. Ёсьць гэта аснаўныя матарыялы, якімі селянін выказваецца, абрабляючы іх спосабам прымітыўным. Дрэва, як матарыял унівэрсальны, мае найшырэйшае застасаваньне. Ужывае яго беларускі селянін, як будульцу, пры будове ўсіх прадметаў сваёй сядзібы, якіх тып, прызнаны традыцыяй, паводле думкі д-ра Альбэрта

Іппля,*) апёрты як-бы на ўзоры грэцкага тэатру й сьвятыні, а некаторыя вясковыя дваркі з ваколіцаў Рагачова прыпамінаюць агульны плян гэленістычна-рымскіх вільляў. З дрэва робяцца характэрныя гэнай-жа беларускай народнай архітэктуры выразаньні ў дошцы, нпр. украшэньні даху, ганкаў, ваконных рамаў і г. п. Дрэва ўжываецца так-жа ў уласнай самадзельнай, скромнай і ў украшэньні прымітыўнай вытворчасьці мэбляў, а таксама ў утылітарнай, із спэцыяльнай арнамэнтыкай, празначанай на рынак вытворчасьці бондараў. З дрэва вырабляецца і гаспадарскае знадоб'е, якое лёгка ня псуецца й ня нішчыцца, — бывае яно багата й цікава аздоблена, нпр. прасьніцы, полкі на ручнікі, заложнікі, ручныя ступкі, лыжкі, забаўкі, каўшы і інш. Іншым матарыялам ёсьць вікліна. Дае яна таксама вялікія магчымасьці аздабляць арнамэнтам чыста тэхнічным, з рознакалёрнай вікліны, вытворчасьць кошыкаў. Вытвары гэтыя аднак досыць рэдкія ў Беларусі. Зблізаным да гэтага матарыялам да пляценьня, менш цікавым дзеля магчымасьцяў камбінацыі арнамэнтаў, але вельмі разнастайным і багатым дзеля формы й выгляду вырабаў, ёсьць салома, лучаная дзёртым дзераўляным валакном або лыкам. Вырабляецца з гэтага матарыялу, часта вельмі прыгожае й вялікае, судзьдзё, якое служа дзеля перахаваньня збожа, нпр. кублы, каробкі і г. п. Выглядам і прапорцыяй прыпамінае яно грэцкія вазы або аграмадныя амфоры. Іншым зноў матарыялам ёсьць гліна — сырэц ганчарства, вельмі пашыранага ў Беларусі, асабліва ў паветах Несьвескім, Маладэчанскім (Ракаў), Ашмянскім, Дзісьненскім, Столінскім (Городно), Пружанскім і Наваградзкім, на прадмесьцях Вільні. Ганчарства ваколіцаў Вільні, працуючае для збыту на рынках Вільні й яе ваколіцаў, абымае вырабы звычайных гаршкоў, збаноў, гладышоў, дваячкоў, місак — з характэрнымі малымі хвалістымі аздобамі па баках, з паліванкай жоўтай, карычневай, зялянкавай, а таксама колеру цёмнага, дэкарацыйна аздобленага прыпадковымі плямкамі, атрыманымі мачаньнем судзьдзя ў хлебным квасе. Іншая катэгорыя цэрамікі—гэта т. зв. сівакі, пайменна гаршкі колеру цёмна-шэрага, чорнага, непаліваныя, з бліскучым арнамэнтам, на матавым фоне. Ёсьць яны надзвычайна цікавыя дзеля свайго артызму, а таксама дзеля вельмі шляхотнай формы й далікатнай камбінацыі эфэктаў бліскучага арнамэнту — на матавым, серабрана-шэрым фоне, — асягнутых матарыялам й тэхнікай выпаліваньня. Вырабляюцца пераважна ў Пружане, у Міры й іншых мясцовасьцях. Таксама вельмі разьвітая вытворчасьць цацак з гліны й цэрамічныя вырабы іншых утылітарных прадметаў, як нпр. ліхтарыкі з мядзьведзямі, баранчыкі да водкі, міньятур-

*) Гл. „Zur weissruthenischen Kunst", у кнізе „Weissruthenien" — W. Jäger Verlag. Бэрлін 1919.

нае судзьдзё, сьвісьцёлкі ў форме качак, кураў, гусей, каровак, конікаў, казачкоў і т. п. Палескае ганчарства знаходзіцца пераважна ў ваколіцах Горадна й слыве сваей яснай, непаліванай цэрамікай, якая аздабляецца чырвонай натуральнай глінкай формы паяскоў, вужыкаў, плямкаў, ідучых канцэнтрычна, пераважна ў верхняй часьці судзьдзя; адзначаецца яна (цэраміка), як і сівакі, вельмі харошымі, амаль клясычнымі формамі.

Характво беларускай цэрамікі, простае, лёгічнае й зразумелае, — абаснаванае нейкімі точнаазначанымі ўтылітарнымі заданьнямі гэнай цэрамікі. Ганчароў у Горадне больш дзьвесьце, а ў воласьці Сіняўка ў Наваградчыне большасьць сялян займаецца ганчарствам.

Вацлаў Гусарскі, разглядаючы ганчарства ў Польшчы — ў сваім артыкуле *„Аб народнай цэраміцы ў Польшчы“* (у часапісе *„Wiedza i życie“* № 5, 1934) — вылучае беларускае ганчарства, дзеля таго, што яно асновамі сваімі розьніцца ад ганчарства раёнаў этнічна-польскіх; Гусарскі характарызуе яго, як наскрось традыцыйнае, архаічнае, бо трымаецца адвечных формаў і дэкорацыйных спосабаў простай і першабытнай тэхнікі.

Міма ейнай першабытнасьці, беларуская цэраміка мае вельмі вялікія артыстычныя вартасьці, бяручыя пачатак з яе прымітыўнага, але шчырага дачыненьня. Не кранула яе сваім уплывам вялікая космапалітычная культура, перахавала яна тысячагодзьдзямі тыя самыя традыцыйныя формы, удасканаліваючы іх з пакаленьня ў пакаленьне штораз лепшым дапасаваньнем да практычнага ўжытку. Падсьведама вычутая нязвычайная гармонія і прапорцыя формаў, прыгоства выгнутай лініі профілю й роўнавага масы даецца параўняць хіба толькі з архаічнай цэрамікай грэцкай. Арнамэнтыка беларускага ганчарства формай ёсьць вельмі архаічная і прыпамінае арнамэнтыку ганчарскіх прадгістарычных вырабаў, нпр. ёлачку, галінкі, вужыкі, паяскі — матывы геомэтрычныя, ігра лініяў асягнута з сапраўдным артызмам.

Характво беларускай цэрамікі — гэта характво дыфэрэнцыяцыі формаў, лёгка адзначаных далікатным арнамэнтам.

Асобныя, як артыстычныя, так і этнічна-нацыянальныя вартасьці беларускай цэрамікі ставяць яе далёка вышэй за цэраміку этнічна польскую і украінскую.

Іншым зноўжа матарыялам, у якім асабліва шчыра, усебакова й дасканальна ў сэнсе артыстычным выказаўся беларускі народ, — гэта валакно. Заспакайваючы свае штодзенныя патрэбы, народ беларускі прыняў пад увагу й мастацкую старану сваіх вырабаў, культывуючы вякамі артыстычныя тканіны з дэкорацыйнымі, адвечнымі, пераказыванымі традыцыйна з пакаленьня ў пакаленьне, узорамі. Найбольш пашыраны палотны льняныя, дзеля лёгкай даступнасьці сырца, а так-

сама дзеля адносна лёгкай ткацкай тэхнікі. Ткуцца палотны рознай таўсьціні, з розным ткацкім павязаньнем — залежна ад празначэньня. У асобнасьці ценкія палотны на Палесьсі ўжываюцца на наміткі, на галаву жанчын-замужак. Ёсьць яны такія ценкія й празрыстыя, як фабрычная маркізэта. З двух канцоў намітка аздоблена вузкім, узорыстым шлячком, вышытым, або найчасьцей вытканым з пары чырвоных нітак асновы.

Найпрасьцейшым дэкарацыйным узорам тканіны — палосы, выкліканыя ўвядзеньнем некалькікалёрных нітак да асновы тканіны. Паласястыя тканіны, спатыканыя ў Беларусі, маюць зусім іншы характар, чым польскія (лавіцкія). Ёсьць гэта калёрныя, грубыя льняныя тканіны. Служаць яны да накрываньня ложак і вазоў. Звычайна сшытыя з дзьвюх шырыняў тканіны. Адзначаюцца сваімі арнамэнтальнымі палосамі, украшанымі дробнымі зубкамі, выкліканымі ўвядзеньнем розных адменаў ткацкіх вузлоў. Цяжкую ткацкую тэхніку здабываюць беларускія жанчыны шляхам традыцыі, твораць аднак штораз то іншыя багацейшыя дэкарацыйныя камбінацыі, ня толькі перадаваныя спосабам традыцыйным, але й творча іх камплікуючы й знаходзячы штораз іншыя ўзоры, якія адказваюць вясковай модзе, а таксама гонару й новаму творчаму ўздыму ткачкі. Адсюль тая рознастайнасьць і жывасьць тканінаў, званых «віленскімі», — і вырабляных на тэрыторыі з насельніцтвам этнічна беларускім і літоўскім. Арнамэнты выключна геомэтрычныя. Складаюцца з прастакутнікаў і квадратаў, уложаных шахаўніцай, крыжыкамі, зоркамі й пераплятанымі кружкамі, эліпсамі ў розным узаемным разьмяшчэньні й адносінах. Каларыт тканінаў — гарманійны, станаваны. Вялікая мастацкая вартасьць гэтых тканінаў — у некаторай няроўнасьці ручным спосабам прадзенай ніткі, у жывасьці выкананьня, якое праяўляецца як-бы малым варыянтам у арнамэнце, часамі неспадзявана, а так-жа багацьцем і неабмежаваным лікам зьменных геомэтрычных арнамэнтаў. Найбольш папулярна ўжыванай камбінацыяй ёсьць г. зв. «дымка». Гэткай самай тэхнікай і паводле тых самых узораў, што й каляровыя тканіны, ёсьць вытыканыя ручнікі й абрусы, крыху далікатнейшыя. Арнамэнт іхні,—які можна пабачыць толькі гледзячы пад сьвет, — атрыманы зьменай напрамку нітак. Палескія ручнікі, вытканыя із звычайнага палатна, закончаны стройным, узорыстым, шырокім паясом, тканым г. зв. «пераборамі», і падобны эфэктам да палескага гафту. Такім спосабам вельмі багата здобленыя спадніцы, фартухі, жаночыя кашулі на наплечніках і рукавох. Калі гаворым аб палескім гафце, трэба сказаць, што мае ён зусім іншы характар ад характару звычайна спатыканага гафту. Зьвязаны ён вельмі цесна із структурай палатна й аканчальным эфэктам амаль зусім ня розьніцца ад частак, тканых спосабам «пераібораў» або спосабам «пертыканьня». Гэтым гафтам упрыгожываюцца кашулі, ручнікі, наміткі й пераміткі, часамі фартухі. Арна-

мэнт цесна зьвязаны із структурай палатна й дзеля гэтага ёсьць геомэтрычны, з перавагай колеру чырвонага або чорнага. Палескі гафт карыстаецца тэхнікай працягваньня калёрнай ніткі ўздоўж нітак упрыгожванага прадмету — палатна. Гэта адна з найстарэйшых гафцярскіх тэхнікаў. Узоры арнамэнту вельмі скамплікаваныя й аснаваныя на розных варыянтах трыкутніка й ромбу. Асабліва прыгожыя йржавыя гафты фартухоў і рукавоў жаночых кашуль з ваколіцаў Берасьця. У заходняй часьці Беларусі, сумежнай з літоўскімі тэрыторыямі, у даволі шырокай паласе спатыкаем тканыя ручным способам вузкія паяскі або кройкі, з арнамэнтам, хоць іншым і сваеасаблівым, але таксама геомэтрычным. Гэтыя паяскі др. А. Іппэль прыроўнівае да грэцкіх «тэніяў». Хараство прасьціні й сынтэзы артыстычных формаў гэных ткацкіх прадметаў дзякуючы тэхніцы найсільней выражаецца найпрасьцейшай і найлёгічнейшай формай.

З іншых галінаў народнага мастацтва трэба сказаць аб разьбе аздобнай і празначанай для рэлігійнага культу. У гэтых катэгорыях разьбы Беларус найпрасьцейшым способам, ясна, шчыра, упрошчанымі й экспрэсыйнымі іх формамі выражае сваю душу.

Тыя самыя прыметы мае й народнае малярства, авеенае нейкай цяплінёй і мяккасьцю душы, задумы й сэнтымэнталізму.

Надзвычайныя артыстычныя вартасьці маюць і народныя дрэварыты, якіх расцьвет прыпадае на XVIII і пачатак XIX стагодзьдзя й якіх прадукцыя знаходзілася ў нейкім кляшторным варштаце на Віленшчыне; пашыраныя па ўсей тэрыторыі б. Вялікага Княства Літоўскага. Дрэварыты гэтыя, магутныя экспрэсіяй, маюць нязвычайна цікавае, характару плоскага, дэкарацыйна-колёрыстычнае састаўленьне.

Кожную галіну жыцьця беларускі селянін стараўся ўпрыгожыць, даць ей якнайпрыгажэйшы выгляд, і ня гледзячы на цяжкія жыцьцёвыя ўмовы, якія не пазвалялі, а то й зусім перашкаджалі пранікнуць найясьнейшаму променю жыцьцёвай радасьці, заняў ён эстэтычнае й оптымістычнае становішча да ўсякіх зьявішчаў жыцьця. Дзеля чаго, з усім, — ці гэта будуць вырабы з дрэва, цэраміка, тканіны, ці цацкі, ці выпек цеста на вясельле, як караваі,—ці на кірмаш, як пернікі, сэрцы, цукровыя цацкі, конікі, ці гэта будуць абрадныя вялікодныя пальмы, што адзначаюцца нязвычайнай гармоніяй колераў, ці таксама вялікоднае, чаруючае сваей калёрнасьцю, яечка, ці ўрэшце сьвяточныя ўбёры, асабліва дзявочыя й жаночыя, як спадніцы, кашулі, гарсэты, кафтаны, сьвіткі, чэпікі й хусткі і т. п., —паўтараю,—з усім, да чаго датыкалася ягоная рука, беларускі селянін абходзіўся як мастак.

Калі шукаць істотных прыметаў беларускага мастацтва й найвярнейшага выражэньня праз яго душы беларускага народу, то гэта ўсё знайдзем першым чынам у беларускім народным мастацтве.

АД. СТАНКЕВІЧ

З літуанізмаў у беларускай мове

К.

Кляваць (націск на «я») — сяк-так жыць, неяк трымацца: як маецца дзед ваш? Вось клявае патроху; літ. **kliautis, klaujasi, kliovési**—спадзявацца на каго, давяраць каму, дзяржацца за каго, за што.

Кляўіца — вёска ў Ашмянск. пав.; літ. **klevas** — клён.

Кавенчыцца — мучыцца, цярпець ад цяжкой працы: ад усходу да заходу бедны кавенчыцца, сьвету Божага ня бача; літ. **kauti, kauja, kové** — біць, забіваць, сячы, раніць у бітцы.

Кàліва — паасобнае зярнё або расьліна чаго-небудзь: ані каліўка(ца) ў арудзе й жыві, калі хочаш! Каліва ад каліва вун гдзе! літ. **kalyvas** (lybas) — зьвярок з белай шыяй, які ярк адметны ад іншых, а так-жа сабака з белым знакам на шыі.

Коўчыць — у сабе зносіць радасьць, гора, перажываньне, не выяўляючы прад другімі: коўчыла ў сабе сваё гора, дый не дала рады, самі сьлёзы паліліся; літ. **kovoti** — ваяваць, змагацца, а мо': **kopti** — зграбаць, абкопваць.

Клямка — зашчапка, закрутка, завала; літ. **klemka.**

Кімса, літ. **kimsa**, — благі луг, пустая трава (медвежий мох). Ужываецца ў ваколіцах Клюшчан, Сьвянцянскага пав.

Клышаногі — крываногі, касалапы; літ. **klišas, klišis, klišti** — крывець, станавіцца крываногім. **Klyšnoti** — няроўна йсьці, клыпаць. Адгэтуль — Клышкі, вёска Крэўскай вол., Ашмянскага пав.

Крэйка — верх страхі, шчыт, грэбень, канёк, konічак; літ. **kraika** — месца, дзе штонебудзь сьцеляць; **kraikyti**—разсыпаць (салому, сена), пасьцілаць; **kreikti** — тое-ж самае.

Кунюткі — каткі, галіны вярбы ці лазы, калі пачынаюць цьвісьці; літ. **kunyti** — уцялесьніць, рабіць нешта цялістым, тоўстым, укормленым; **kunuotas** — укормлены, мясісты.

Каранды — вёска ў Крэўскай вол.; літ. **rasti** — знаходзіць што; **randa** — ён знаходзіць, **ko randa** — што ён знаходзіць?

Кульшà — бядро, сьцягно, ляшка; літ. **kulše**; магчыма ад гэтага: клюшня ў рака, Клюшчаны.

Кратацца — рабіць што, быць дзейным, жывым. Як жывеш? Вось кратаюся патроху; літ. **kratyti** — трасьці, страсаць, патрасаць, трэсьці каго (шукаць чаго).

Клікаць — зваць, запрашаць; літ. **klykauti** — крычаць, галасіць, гаманіць; **klyknoti** — пакрыкаваць. Слова гэта ёсьць

і ў расейскай мове; надта магчыма, што яно ёсьць славянізмам у літоўскай мове, ці вярней — беларусізмам.

Курманіха — засьценак у Крэўскай вол., між Крэвам і Барунамі; літ. **kurmis** — крот, **kurmiena**—кратовае мяса, **kurminis** — кратовы.

Клуня — стадола, гумно; літ. **kluonas**. Адгэтуль — клунак — пакунак.

Клябанія — дом парафіяльнага ксяндза, сьвяшчэньніка; літ. **klebonas** — пробаршч, парох.

Кена — чыгуначная станцыя пад Нова-Вялейкай і сяло; літ. **kieno** — чый

Кемялішкі — сяло ў Віленска-Троцкім пав.; літ. **kiemas** — вёска, падворка.

Каіценяты, Каяценяты — вёска ў Гальшанскай вол., Ашмянскага пав.; літ. **kaitéti** (kaita) — беспакоіць, турбаваць, перашкаджаць, шкодзіць; **kaitèti** (kaiteja) — пацець.

Курта — сука, сучка; курта ты! літ. **kurtas**—сабака, хорт.

Касьнік — істужка ў косы; літ. **kasnykas**; **kasnis**—кусок.

Калтуя — цапілно, кій, да якога прычэпліваецца цэп для малацьбы; бічавіска; літ. **keltuvé** — значэньне тое-ж; **kalti** — каваць, высякаць (з каменя), выдаўбаць, убіваць.

Кіпці — капцюры, пазуры; літ. **kibti** — чапіцца, прычапляцца, прыставаць, прыдзірацца.

Кніпці — капцюры, пазуры, ногці, пазногці; літ. **gnybti**— шчыпаць, шчапіць, прышчапіць, сьціскаць шчыпцамі; прычым літ. **g** пераходзіць у бел. к і **b** у п.

Кумпяк — шынка, вандліна; літ. **kumpis**; **kumpinti**—крывіць, выкрыўляць, выгібаць.

Кунава — вёска між Смургонямі й Крэвам; літ. **kunas** — цела.

Клыпаць, паклыпнуць — спатыкацца, падаць на калені: конь на чатырох нагах і то паклыпае; літ. **klipti (klimpa, klipo)**, **klypti (klypsta, klypo)** — крывіцца, касіцца, зрушыцца з месца; **klupti (klumpa, klupo)** — спатыкацца, падаць на калені; адгэтуль — клумпі.

Кудра — стаў, сажалка (Баранавіцкі пав.), кучка дрэў, што расьце дзе адзінока (Ашмянскага пав.); літ. **kudra**—стаў, сажалка.

Кудзеля; літ. **kuodas** — чуб, хахол; **kuodelis** — завітушка, кудзеля, прадзева.

Крушня — куча каменьняў; літ. **krusnis**.

Курстаць — рушаць (справу), падганяць (каня); літ. **kurstyti** — нагаварываць, агітаваць, падвучаць, бунтаваць, распаліваць (гнеў, любоў, вогнішча, агонь).

Кіла — прарыў у канцы пахвінаў жывата, парасейску — грыжа; літ. kilti (kyla, kilo) — устаць, уставаць, падымацца, падняцца, павысіцца, расьці, узьляцець, прыбываць (аб вадзе), рабіцца яўным.

Крапштаць, крапштацца, крэпштаць — калупаць (у носе), калупацца (пры рабоце); літ. krapštyti — калупаць.

АД. РЭДАКЦЫІ: Праца нашага Паважанага Супрацоўніка, Кс. Адама Станкевіча над літуанізмамі ў беларускай мове, якой некалькі частак ужо мы надрукавалі, знайшла водгук у газэце „Беларускі Фронт". Гэтая газэта ў нумары 10-ым 15.V.39. зьмяшчае доўгі артыкул „Аб „літуанізмах" Адама Станкевіча", падпісаны літарамі „Ш—ць". Артыкул агулам кажучы рачовы й карысны, нажаль сапсуты мясцамі някультурнымі й дэмагогічнымі выпадамі, супроць чаго мы змушаны пратэставаць.

Падтрымліваем цалком становішча В. Паважанага Кс. Адама Станкевіча ў справе гэтага артыкулу, выражанае ў надрукаваным ніжэй ягоным пісьме.

Паважаны Грам. Рэдактар,

не адмоўце памясьціць у „Калосьсі" гэтых некалькі слоў:

Я дужа ўдзячны гр. Ш—ць („Бел. Фронт" № 10, 15.V.39) за крытычныя й фаховыя ўвагі да маей працы „З літуанізмаў у беларускай мове"; падчыркваю — за крытычныя й фаховыя, характару языкаведнага, бо-ж, апрача гэтага, чаго там толькі няма?! Але transeat! Мне йдзецъ аб дасьледжаньне літуанізмаў у беларускай мове й з слушных (а ня ўсе там гэткія!) заўвагаў у гэтай праблеме я ахвотна скарыстаю, калі праца мая будзе выходзіць асобнай адбіткай. Тады выкажу так-жа свой пагляд і што да тых заўвагаў гр. Ш—ць, з якімі я не згаджаюся.

Прыміце, Гр. Рэдактар, словы маей да Вас пашаны.

Ад. Станкевіч

Слонім, 17.V.39.

Іван Саланевіч

Аб Івану Саланевічу мала хто з Беларусаў што-колечы ведае, а ён цярпеў, працаваў, змагаўся й далей няўтомна змагаецца за сваю справу. Жыве ён у Бэрліне, а ў Софіі выдае тыднёвік пад назовам «Наша Газета», у каторым вядзе напружаную барацьбу з бальшавізмам пад сьцягам вялікай і непадзельнай Расеі.

Чытачы «Калосься» падумаюць: — тут нейкая няўвязка, нехта змагаецца з бальшавізмам, вельмі добра, але што-ж супольнага мае гэты расейскі чорнасоценец з беларускім народам?

Дык вось, у сваей векапомнай працы «Россия в концлагере», у каторай ён надта маляўніча апісвае сваё прабываньне ў савецкім лагеры ў Карэліі й уцечку адтуль, гэты дзеяч коратка й ясна падчыркнуў уласную беларускасьць і свае адносіны да Беларусаў і беларускай справы.

Аб двухтамовай кнізе Саланевіча пісаць ня будзем, у кожным выпадку, хто прыпамінае перадваенныя сшыткі «Нат Пінкертон кароль сышчыкаў», той будзе мець належнае прадстаўленьне аб літаратурных прыёмах і вартасьцях аўтара.

Важна тое, што ў першым томе «Россіі в концлагере» у кароткай дэкларацыі ён заяўляе: — Я стопрацэнтовы Беларус і магу ганарыцца тым, што мяне ўзгадавалі на Пушкіну, ані на якімсьці Янку Купале; маю пагарду да патрыётызмаў у павятовым маштабе й да нацыянальнага будаўніцтва з соймам у Менску ці ў Вільні. — Апошняе, дзеля асаблівай кур'ёзнасьці й дзеля спадобы, ня вельмі вымагаючай, у сваей масе, расейскай публіцы падана поўпабеларуску. Адным словам, прыпраўлена «з душком».

Бязумоўна, гэты вырадак не прачытаў аніводнага верша Купалы й ня мае мінімальнага паняцьця аб сучасным беларускім адраджэнскім руху, — але сваю «прафэсарскую апінію» ён выражае дужа аўтарытэтна.

Наагул, вырадкаў маем нямала, стагодзьдзі нацыянальнага заняпаду даюцца ўзнакі, тым ня менш такіх тыпаў, як Саланевіч, афішуючыхся стопрацэнтавай беларускасьцю, трэба біць, прынамсі, па брудных лапах. Няхай ня думаюць, што калі яны знаходзяцца далёка ад беларускіх цэнтраў, дык маюць магчымасьць бяскарна ізрыгаць свае істінно-русскія блявоціны на беларускі народ.

Хто чытаў «Расею ў канцлагеры», прыпамінае, напэўна, што было духовым апірышчам аўтара падчас лагернага жыцьця. Гэта ягоны сын Юры ў мамэнты дэпрэсыі бацькі напяваў яму дзеля бадзёрасьці песьні Верцінскага.

Дробязь, але вымоўна характэрызуючая духовы клімат розных Саланевічаў. Беларуская музыкалёгія ні Верцінскага ні падобных яму іншых шарманшчыкаў ня мае, таму, магчыма, для гэткае публікі тут недзе трэба шукаць жаролаў духовае няпрымірымасьці.

Пасьля ўцечкі з лагеру, «наш герой» хутка заінсталяваўся ў расейскай эміграцыі — падыйшоў пад колер. Пэўныя колы ўважаюць яго нават за нейкага аракула, іншыя йзноў называюць савецкім агентам і правакатарам. Зрэштай, гэта іх сямейная справа.

Арганізуе нацыянальны «трудавы» саюз новага пакаленьня — няхай арганізуе, палемізуе з Мілюковым — няхай палемізуе, але быламу савецкаму спэцу (праектаваў будову стадыёнаў Дынамо), а цяпер альфонсу расейскай эміграцыі рашуча забараняем паганіць беларускую справу. Можа свае жарты сьціраваць у іншы бок.

З узгляду на актуалізацыю беларускай справы, гэны цынічны рэнэгат (родам, здаецца, з Менска) можа рабіць спробы перакінуцца на беларускі грунт. Трэба, каб нашае грамадзянства добра запомніла ягонае прозьвішча.

Паўтараю: — Іван Лукіяновіч Саланевіч.

А. Бужанскі

Кнігапіс

Teodor Iljaszewicz — **Drukarnia Domu Mamoniczów w Wilnie (1575—1622).** Wilno, 1938. Wyd. T-wa Pomocy Naukowej im. E. i E. Wróblewskich, бач. 155, фармат 8°.

Пад гэткім загалоўкам у канцы мінулага году паявілася ў сьвет кніжка маладога беларускага вучонага Хведара Ільляшэвіча. Гэта, здаецца, яго праца для атрыманьня навуковага званьня пры сканчэньні U.S.B. і дзеля гэтага выдана папольску.

Падбор тэмы дужа ўдалы, можа быць узорам беларускім студэнтам, якія часта выбіраюць тэмы, над якімі працаваць шкода часу.

Праца з боку тэхнічнага без закіду. Друкавана ў друкарні «Краёвай», якая ў друкарскай тэхніцы што да мастацтва сярод друкарняў у Вільмі займае бадай першае месца.

Нічога так-жа няможна закінуць аўтару й што да навуковай мэтодолёгіі.

Усё, што вымагаецца ад працы, каб яна была ўложана

й апрацавана па навуковаму, у кніжцы Хв. Ільляшэвіча знаходзіцца. Пільным, відаць, быў студэнтам, старанным працаўніком на сэмінарыях, а пасьля вытрывалым і сумленным дасьледчыкам праблемы аб друкарні Мамонічаў, у кніжку аб якой улажыў сапраўды шмат працы й веды.

Кніжку папераджаюць удала падабраныя тэксты: украінскі, адрывак з працы праф. Іл. Сьвенціцкага аб друкарстве, і беларускі верш М. Багдановіча «Псалтыр». Тэксты гэтыя, поўныя романтычнага пачуцьця да старадаўнай друкаванай кніжкі, ярка выражаюць той любоўны настрой, з якім аўтар адтварае друкарскую працу Мамонічаў і ўсталяе плады іх працы, надрукаваныя імі кніжкі.

У прадмове слушна аўтар кажа, што «досьледы над друкарствам маюць вялікае значэньне, калі йдзе аб адтварэньне культурнага стажу грамадзянства. Кніжка ёсьць фактам культурным. Ёсьць яна вынікам культурных здабычаў і людзкіх запатрабаваньняў». З гэтай мэтай і прыступае ён да прадстаўленьня магчыма поўнага абраза друкарскай у Вільні дзейнасьці Лукі, Кузьмы і Лявона Мамонічаў у апошняй чверці XVI і ў першай XVII стагодзьдзя.

Пасьля прадмовы наступае багаты, лікам 113, сьпісак прац і крыніц, якімі аўтар пры пісаньні сваей кніжкі карыстаўся. Сярод працаў не азначана,—відаць, аўтар з ей не спатыкаўся,—кніжка Булгакава: «Кнігопечатаніе на Русі», ці нешта падобнае; кніжка гэта знаходзіцца ў маей бібліятэцы ў Вільні й тут, у Слоніме, пад рукой яе ня маю. Прыпамінаю, што аб друкарскай працы Мамонічаў нешта там знаходзіцца. Але й сам аўтар сьведамы таго, што азначаная й выкарыстаная ім літаратура ня ёсьць поўнай, аб чым ён лёяльна заяўляе. У ўвагах аб літаратуры, гаворачы аб працы І. Лаппы („К исторіи русской печати. Виленская типографія Мамоничей"), аўтар слушна вытыкае Лаппе памылковасьць залічаньня друкарства Мамонічаў да... расейскага, але й ня кажа, што, з малымі выняткамі, залічыць яго трэба да беларускага.

У ўступе аўтар падчырквае аб вынаходзе друкарства агулам, аб яго значэньні, а так-жа аб працы друкарскай Фр. Скарыны ў Празе й у Вільні й аб адносінах друкарства Скарыны да друкарства Мамонічаў.

Спатыкаем тут пару думак, з якімі цалком згадзіцца ня можна. «Ня будзем, кажа аўтар, разводзіцца над цэлым вынаходам друку, які пацьвярджае, па мойму, ведамы прынцып, што патрэбы эканамічныя выклікаюць адкрыцьці».

Пэўне-ж, але патрэбы эканамічныя гэта ўжо нешта другараднае, адкрыцьці выклікае прадусім ніколі ненасытная веды душа чалавека.

Занадта такжа, здаецца мне, аўтар паддаецца паглядам некаторых польскіх вучоных (Ловмянскі) аб дужа быццам нізкім роўні культурным Вял. Кн. Літ. у першай палавіне XVI ст.

Пасьля ўпадку Візантыі ў XV ст. Праваслаўная Цэрква, якая была апорай культуры, пачала пераджываць цяжкі крызыс. Адбілася гэта, ведама, і агулам на культуры краю. Аднак так званыя вышэйшыя слаі грамадзянства, якія былі выключнымі носьбітамі культуры, за які век навязалі лучнасьць з заходам і нямала з яго карысталі. Павевы гуманізму й рэнэсансу даходзілі аж да зямель Вял. Кн. Літ. Як многа пад гэтым узглядам гавора нам хоць-бы вялікі наш Фр. Скарына і слаўныя нашы законы!

Першы разьдзел працы Хв. Ільляшэвіча пасьвячаны паўстаньню друкарні Мамонічаў і першым гадом яе існаваньня. Дакладна тут ён апісвае пачаткі друкарні Мамонічаў, сувязь яе з друкарствам Скарыны і роль у мамонічаўскай друкарні ведамага вучня Скарыны Пятра Цімафеевіча Мсьціслаўца. Друкарня Мамонічаў, як усталяе аўтар, знаходзілася ў Вільні, у нарожным доме вул. Вялікай і Шклянная, якога падае здымкі.

У выснавах да першага разьдзелу спатыкаем думку аўтара, што друкарства Скарыны паўстала прыпадкам, а Мамонічаў было выклікана культурнымі патрэбамі асьвечанага мяшчанства. Вось-жа што да Мамонічаў, дык ня можа быць сумніву, што так, але, здаецца мне, што й Скарыны праца таксама ня была прыпадковай і так-жа была выклікана культурнымі патрэбамі беларускага грамадзянства, толькі што гэныя патрэбы былі яшчэ меншымі й часта бліжэй не азначаныя. Прынамсі сам Вялікі Скарына дакладна ўяўляў сабе тыя культурныя патрэбы свайго народу, якім ішоў насустрач. А гэта ўжо ня прыпадак.

Другі разьдзел працы Хв. Ільляшэвіча дасьледжвае дзеі друкарні Мамонічаў ад году 1577, калі адыйшоў Мсьціславец, і да году 1607, калі памёр Лукаш Мамоніч, галоўная апора друкарні. У гэтым пэрыядзе друкарня, апрача кніжак кірыліцай, друкуе так-жа й кніжкі польскія лацінскай готыкай, хоць яшчэ дужа мала.

У гэтым часе адбываецца рашучы наступ лацінізму на Беларусаў і на іх Праваслаўную Цэркву. Вось-жа Мамонічы, будучы яшчэ праваслаўнымі (пасьля перайшлі ў унію, а пазьней, магчыма, і ў лацінства), сваей друкарскай дзейнасьцяй у абароне веры, а разам і беларускай народнасьці, адыгралі аграмадную ролю, на што аўтар, здаецца, не зварачвае належнай увагі.

Разьдзел трэці пасьвячаны Лявону Мамонічу, які меў тытул каралеўскага друкара. Гэты Мамоніч, з праваслаўнага стаўшыся уніятам, пры помачы свайго друкарства вялікія аказаў Уніі ўслугі, а так-жа й культуры. Дзякуючы аднак таму, што Унію палітычныя дзейнікі накіроўвалі на польскія торы, Лявон Мамоніч больш ужо друкаваў польскія кніжкі, як кірыліцкія. Друкарня яго перастала існаваць у 1622 г.

Капітальнай важнасьці разьдзел чацьверты — аб ролі

друкарні Мамонічаў у жыцьці культурным Вял. Кн. Літ. і іншых славянскіх краёў. З гэтага разьдзелу даведваемся, што прасьветная праца гэтай друкарні не агранічалася толькі беларускімі землямі, дзе кніжкі, друкаваныя ў Мамонічаў, былі ўжываныя па цэрквах, школах і дома, як падручнікі для навукі чытаньня й пісаньня, але сягала так-жа да славян паўдзённых і да Маскоўцаў.

Друкарскую працу Мамонічаў аўтар за праф. Пічэтай характарызуе, як кірунак гуманістычна- консэрватыўны. Яны ня брालі пад увагу народнага языка, як гэта рабіў Скарына, а, ідучы на спатканьне шляхоцка-мяшчанскім патрэбам, кніжкі свае друкавалі выключна (ня лічачы польскіх) языком царкоўна-славянскім. Гэта праўда. Але ня трэба забывацца, што й гэтак Мамонічы служылі народнай справе й зьяўляліся яе культурнай апорай у барацьбе з польскім націскам.

З апошняга разьдзелу, пятага, аб прычынах упадку й аб лёсе друкарні Мамонічаў, даведваемся, што ўпала яна найхутчэй з прычын конкурэнцыйных, бо, як кажа Лелевэль, між 1580 і 1650 г. было ў Вільні й у іншых мясцох Вял. Кн. Літ. аж 15 друкарняў, „iż by do ludu ruskiego przemawiały".

А дзе-ж Л. Мамоніч дзеў сваю друкарню, зьліквідаваўшы друкарска-выдавецкую працу? Аўтар даходзіць да выснаву, што друкарня гэта перайшла да айцоў Базыліянаў у Вільні й праўдападобна мясьцілася ў сутэрэне кляштару пры стыку двух лініяў — паўдзённай і заходняй.

Далей ідзе ў працы Хв. І. сьпіс мамонічаўскіх друкаў, які адказвае на гэткія пытаньні: 1) назова друку, 2) чысло выданьня, 3) колькасьць бачын, 4) фармат і тыя крыніцы й аўтары, у якіх аб мамонічаўскіх друках ёсьць зацемка. Усіх, напэўна мамонічаўскіх, друкаў аўтар усталіў 60, а сумніўных — 14, усіх разам — 74.

Аднак лічба гэта ня знача, што толькі гэтулькі, а больш ня было друкаў, якія выйшлі з друкарні Мамонічаў. Аўтар кажа, што ведамы яму яшчэ друкі, якія, ня маючы паказанай друкарні, няведама, у якой друкарні былі друкаваны, а якія, пры параўнаньні іх з друкамі друкарні Мамонічаў, надта магчыма, што аказаліся-б таго-ж самага паходжаньня. Аўтар аднак праступыяваць гэтую праблему, як сам кажа, ня меў магчымасьці.

Ня трэба так-жа забывацца, што час (канец XVI і пач. XVII ст.), калі працавала друкарня Мамонічаў, гэта час заўзятай барацьбы рэлігійнай, калі кніжкі, варожыя таму ці іншаму рэлігійнаму абозу, былі нішчаны. Гэткі лёс мог спаткаць не адну кніжку з друкарні Мамонічаў.

Дзеля гэтых прычын агулам трудна ды й немагчыма гаварыць аб устанаўленьні поўнага сьпісу мамонічаўскіх друкаў. Той аднак сьпіс, які усталіў Хв. І., мае вялікае навуко-

вае значэньне—гэта грунтоўная падстава для далейшых студыяў над мамонічаўскімі друкамі.

Урэшце, на канцы кніжкі памешчаны паказчык асоб, якія ўспамінаюцца ў працы, паказчык зьместу й ілюстрацыяў, а так-жа друкарскія абмылкі, якіх сабралася, на жаль, ня так і мала.

Кніжка Хв. Ільляшэвіча — гэта значны ўклад у маладую беларускую навуку. Агульнай аднак нястачай кніжкі зьяўляецца нявыразны яе воблік беларускі. Мамонічы — гэта беларускія патрыёты й беларускія культурнікі й кніжкі іх празначаны для беларускага народу. Тымчасам гэта ў Хв. І. ня тольkі што з націскам не адзначана, але нават як-бы саромліва прыхавана пад бліжэй неазначанымі тэрмінамі: «Русь, рускі, патрыёт, Вял. Кн. Літоўскае» і інш. Я разумею, што да гэткай «саромлівасьці» што да беларускасьці прымушалі аўтара абставіны, у якіх праца была пісана й выдавана. Затое цяпер аўтар павінен сваю цэнную працу пералажыць на беларускі язык, паставіць «беларускія точкі» над усімі «і», раскрыць усе «дужкі», паставіць, дзе трэба, «беларускія націскі» і... пабеларуску выдаць. Але хто выдасьць?

Гэтая кніжка мусіць праявіць сваю беларускую «душу» й мусіць прыадзецца ў сваю беларускую «вопратку».

Ад. Станкевіч

Слонім, 27.IV.39.

Новая праца з гісторыі беларускага языка

Норвэг Хр. С. Штанг (Stang), праф. унівэрсытэту ў Ослё, надрукаваў сёлета другую сваю працу з гісторыі беларускага языка: *Die altrussische Urkundesprache Der Stadt Polock von Chr. S. Stang. Skrifter utgitt av Norske Videnskaps. Akademi i Oslo. II. Hist.-Filos. Klasse. 1938. № 9. Oslo 1939, бач. 148 фармату 12×21 цм.* Першая праца ягоная аб мове вяліка-княскіх канцылярыяў Вялікага Княства Літоўскага выйшла ў 1935 г. У гэтай, другой, працы аўтар разглядае мову полацкіхурадавых памяткаў XIII—XVI стаг.

Канчальны вывад аўтараў аб старой мове полацкай — гэткі: мова полацкіх памяткаў ад самага пачатку беларуская. Яна выразна розьніцца ад мовы памяткаў пскоўскіх і блізу нічагусенькі ня розьніцца ад мовы памяткаў Смаленскіх. У XV стаг. мова полацкіх памяткаў памалу ўпадабняецца да тагачаснай беларускай мовы літаратурнай — урадовай у Вял. Княстве Літоўскім, а ў XVI стаг. зусім із ёю зьліваецца.

Праца праф. Штанга вельмі салідная й яе павінен прастудыяваць кажны беларускі языкаведнік.

Я. Ст.

Хроніка

— У Беларускім Навуковым Т-ве: 14 траўня адбылася зборка літаратурна-мастацкае сэкцыі, на каторай Максім Танк прачытаў тольккі-што закончаныя першыя пяць частак сваей новай паэмы „Сілаш Істома“. Пасьля адбылася ажыўленая дыскусія.

На гэтым паседжаньні адбыліся выбары старшыні літ.-маст. сэкцыі. Аднагалосна выбраны за старшыню мгр. Хведар Ільляшэвіч.

— У Беларускім Музэі ім. Івана Луцкевіча ў Вільні ў працягу „III-га Тыдня Прапаганды Музэяў“ лічба адведываючых была 2.685 асоб (у тым 52 экскурсіі).

Падчас „Тыдня“ вельмі істотную помач аказала Бел. Музэю беларуская студэнцкая моладзь, якая самаахвярна працавала восем дзён, даючы адведываючай публіцы неабходныя выясьненьні й гзедзячы за парадкам у Музэі.

— Паэт Міхась Машара прырыхтаваў свой новы зборнік паэзіі, які здаецца ўжо ў друк. Над прырыхтаваньнем у друк сваіх зборнікаў працуюць паэты Хмара, Іверс і Бярозка.

— Міністэрства Унутраных Спраў не зацьвердзіла статуту Беларускага Саюзу Абстынэнтаў, які меўся зарганізавацца ў Вільні.

— Нашыя супрацоўнікі кс. Адам Станкевіч і інж. Адольф Клімовіч, ваяводзкімі ўладамі выселеныя ў канцы мінулага году з Вільні, з дазволу гэтых-жа ўладаў вялікоднымі сьвятамі адведалі Вільню.

— Выйшлі з друку паштоўкі з фатаграфіямі 6-цёх твораў Беларусаў - мастакоў: Мірановіча, Сергеевіча, Драздовіча. Цана паштоўкі — 30 гр.

— Украінскі кампазытар праф. А. Кошыц (Нью-Іорк) згарманізаваў нядаўна для мяшанага хору беларускую народную песьню.

— 2 красавіка г. г. у памешканьні Т-ва беларускіх вучыцялёў (Рыга) С. П. Сахараў зрабіў даклад на тэму „А. П. Сапуноў, як беларускі гісторык“. На грунце пэрсанальных успамінаў і на грунце каштоўных навуковых прац А. П. Сапунова з гісторыі Віцебшчыны й Полаччыны, дакладчык пазнаёміў слухачоў з беларускім нестарам, як можна з поўным правам назваць А. П. Сапунова.

Да Сапунова гісторыя Беларусі была чыстым аркушам. Ён усё сваё жыцьцё прысьвяціў архіўным досьледам сваей роднай гісторыі. Яго многалічбовыя творы, пачынаючы з „Витебской старины“, зрабілі цэлую эпоху ў гісторыяграфіі Беларусі.

— Новае беларускае таварыства ў Латвіі. Цяпер у Латвіі ёсьць адзіная беларуская арганізацыя „Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі“. Таму, што гэта больш прафэсіянальная арганізацыя, то замест яе ўхвалена стварыць „Нацыянальны Хаўрус Беларусаў у Латвіі“. Ужо паданы адпаведны статут на зацьверджаньне міністэрству грамадзкіх спраў і чакаецца яго зацьверджаньня.

— 15 красавіка г. г. у Т-ве беларускіх вучыцялёў адбыўся рэфэрат на тэму: „Задачы беларускай інтэлігенцыі“.

— Дума культурнага фонду, пад кіраўніцтвам прэзыдэнта Латвіі Карліса Ульманіса, на сваім паседжаньні 5 красавіка г. д., пастанавіла выдаць С. П. Сахараву (б. дырэктару Дзьвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі) 700 лат за прадстаўлены ім у культурны фонд зборнік пад назвай „Народная творчасьць Латгальскага Беларуса“.

С. П. Сахараў працаваў над гэтым зборнікам больш 5 год. У зборнік увайшло каля 1200 народных твораў, якія сабраны, як С. П. Сахаравым, так і беларускімі вучыцелямі й вучнямі за час 1922—1938 г.г.

— Беларускім вучыцельскім хаўрусам у Латвіі 6 траўня г. г. зарганізавана спэктакль-вечарына. Спэктакль быў папярэджаны адноснымі дакладамі й канцэртным нумарам, у якім выступала сьпявачка А. Латонас-Дзямідава, якая з пасьпехам выканала некалькі латыскіх і беларускіх песень На спэктакль зложылася бытавая п‘еса Я. Купалы „Паўлінка“, добра

й жвава адыграная драматычнай сэкцыяй пры вучыц. хаўрусе пад кіраўніцтвам Ф. Дамброўскага. Пасьля спэктаклю адбыліся скокі. Вялікая заля была перапоўнена публікай. Сярод публікі былі прадстаўнікі латыскага, літоўскага, расейскага й украінскага грамадзянства.

— 25.III у Каўнасе адбыўся агульны гадавы сход Беларускага Культурна-Асьветнага Т-ва ў Літве.

— 10.III Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва ў Літве наладзіла прадстаўленьне.

— Беларусы ў Аргентыне, зарганізаваныя ў Беларускім Т-ве „Культура“, у сталіцы Аргентыны— Буэнос-Айрэс — наладзілі беларускі спэктакль. Пры Т-ве „Культура“ існуе хор. Т-ва налічае каля 180 сяброў,

— Беларускія работнікі ў Парыжы 12.II пастанавілі на сваім сходзе ладзіць публічныя лекцыі аб Беларусі й беларускія прадстаўленьні.

— Маскоўскія ўлады ў Беларусі робяць розныя экспэрымэнты над беларускім языком у пісьме й друку. Апошнім часам дыскутуецца „патрэба“ зьмены беларускага правапісу й морфолёгіі, ясна, у кірунку ўпадабненьня беларускага языка да расейскага. Ёсьць прапановы нейкага Барысенкі й Гурскага скасаваць у правапісе нават самую найгалаўнейшую асаблівасьць беларускага языка — г. зв. „аканьне“. Па прыняцьці такой прапановы — пісалі-б і друкавалі-б нпр не „галава“, а „голова“.

— Пісьменьнікі БССР напісалі вершам новае пісьмо „роднаму бацьку“ Сталіну, у якім аж захліпаюцца ад казённай радасьці й удзячнасьці для гэтага дыктатара за ягоныя „дабрадзействы“ для Беларусі. Для раўнавагі пачуцьця трэба было-б аўтарам пісьма прадставіць мора сьлёз, енкі й пакуты замучаных рэжымам „роднага“ Сталіна сотняў тысячаў Беларусаў, у тым ліку і сотняў пісьменьнікаў, мастакоў, артыстаў, навукоўцаў, культурнікаў.

— 10 сакавіка ў Менску ўрачыста аддаены ў эксплёатацыю новы будынак Дзяржаўнага Вялікага Тэатру опэры й балету. Абыймо будынку — 163 тысячы куб. мэтраў. Гэты мамэнт адзначаны пастаноўкай беларускай сав. опэры „Міхась Падгорны“—лібрэтта паэта Пятруся Броўкі, музыка кампаз. Цікоцкага. У будынку будзе мясьціцца тэатральнае вучылішча.

— Бел. сав. кампазытар Н. Н. Шчэглоў напісаў другую сымфонію, у якой прадстаўлена гісторыя беларускага народу ў мінуўшчыне й сучаснасьці. — Сымфонія багата беларускімі народнымі мэлёдыямі. 18 сакавіка першы раз выканаў яе Дзяржаўны сымфанічны аркестр фільгармоніі БССР.

— 25 сакавіка скончылася 20 гадоў ад заснаваньня ў Магілеве пачаткавай музычнай школы ім. Рымскага-Корсакова. За ўвесь час свайго існаваньня школу скончыла каля 500 асоб. Школа ў 1938 г. зарганізавала каля 40 канцэртаў. Свой юбілей школа адзначала 7-га красавіка. Сёлета ў школе вучыцца каля 400 дзяцей. Дзеці, па сканчэньні школы, прадаўжаюць музычную асьвету у заложаным у 1937 г. у Магілеве музычным вучылішчы.

— Дом народнай творчасьці БССР праводзіць рад мерапрыемстваў дзеля вывучэньня беларускага народнага танцу.

Супрацоўнікі «Калосься»: *В. Багдановіч, А. Бужанскі, А. Бярозка, М. Васілёк, Ст. Грынкевіч, А. Дубровіч, Хв. Ільляшэвіч, А. Іверс, С. Каліна, А. Клімовіч, Я. Крыга, М. Машара, М. Пяцюкевіч, С. Сахараў, Кс. А. Станкевіч, Я. Станкевіч, П. Сірата, П. Сергіевіч, М. Танк, С. Хмара, А. Чэмер, Ул. Чэмер, М. Шкялёнак, Р. Шырма.*

Redaktor-Wydawca Jan Szutowicz   Рэдактар-Выдавец Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш. друкі

Др. Я. Станкевіч — Гісторыя беларускага языка, бач. 16. Вільня, 1939.
Lietuviškas Baras, № 4, Вільня.
Versme, 1939. Вільня
Вістник, кн. 5, Львоў.
Живо Слово, 3. Львоў.
Рідна Мова, ч. 3, 4, 5. Варшава.
Wilno, № 1. Вільня.
Oriens, сш. 2. Варшава.
Problemy Europy Wschodniej, № 3. Варшава.

Ад Рэдакцыі і Адміністрацыі:

Друкарскі набор чарговай (3) кніжкі „Калосься“ пачнецца 1 чэрвеня. Просім дзеля гэтага Паважаных Супрацоўнікаў парупіцца ў пару прыслаць да друку матарыял.

Усіх-жа Чытачоў, якія не ўрэгулявалі належнасьці за часапіс, просім гэта зрабіць якнайхутчэй. Нумар паштовага перaказу разрахункoвага нашага часапісу 58.